Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЖНІЎНЯ 2017 г. СУБОТА №154 (28518)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЁСЦЬ МІЛЬЁН!



Фота БЕЛТА.

Камбайнер-двухтысячнік Аляксандр АНЦІПЦАЎ.

**11 жніўня мільённую тону збожжа сабралі ў Мінскай вобласці. Камбайнераў-двухтысячнікаў дзяржпрадпрыемства «Саўгас «Рачкавічы» Беларускай чыгункі» ў Слуцкім раёне павіншаваў першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Ігар Макар. На прадпрыемстве сабрана 4 тыс. тон збожжа, а ўсяго ў Слуцкім раёне — 100 тыс.тон.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«У развіцці райцэнтраў трэба рабіць стаўку на дзяцей. Гэта наша будучыня. Выхоўваць падрастаючае пакаленне адным толькі словам немагчыма. Трэба ствараць умовы для якаснага навучання, усебаковага развіцця і камфортнага жыцця дзяцей, пачынаючы ад дзіцячага садка, школы, спартыўнай залы, музычнай школы, іншага. Вось гэта наша задача».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9521 | ▲ |
| Еўра | 2,2947 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0759 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жніво-2017

# ХЛЕБАРОБЫ Ў ПАГОНАХ

## Як вайскоўцы дапамагаюць аграрыям збіраць ураджай



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Свой уклад у агульны каравай краіны ўносіць і радавы кантрактнай службы Дзяніс ЦЫЦУЛЯ.

**Міністэрства абароны высаджвае свой «дэсант» на хлебныя палеткі ўжо не першы год. На некалькі тыдняў вайскоўцы становяцца хлебаробамі ў пагонах. Вядома, на камбайны іх не садзяць — сучаснай тэхнікай кіруюць толькі прафесіяналы. А вось быць за рулём грузавых аўтамабіляў — акурат у ваеннай кампетэнцыі.**

Штогод Мінабароны выдзяляе на ўборку ўраджаю не толькі спецыялістаў, а і сваю тэхніку. Сёлета, напрыклад, вайскоўцы дапамагаюць збіраць збожжа ў Мінскім, Старадарожскім, Асіповіцкім і Мсціслаўскім раёнах краіны. Дзеля гэтых патрэб вылучана каля 50 адзінак аўтамабільнай тэхнікі.

### Да вайскоўцаў — ніводнай заўвагі

На прыбліжаных да сталіцы палетках аграрыям дапамагаюць ваеннаслужачыя 65-й аўтамабільнай і 30-й чыгуначнай брыгад. Працоўны дзень для іх пачынаецца з усходам сонца — падчас уборкі кожная хвіліна на вагу золата. Не спыняецца ў іх работа і пасля таго, як наступіла цемра. Некалькі гадзін сну — і зноў у поле.

Для старшыны кантрактнай службы Сяргея Свірскага такі распарадак дня не новы. Нарадзіўшыся ў вёсцы, пра жніво ён ведае не па чутках. Цікава, што абодва яго браты ў гэты час таксама працуюць на агульны каравай краіны.

— Адзін з братоў — камбайнер, пакуль лепшы па Брэсцкай вобласці, — з гонарам кажа Сяргей. — Малодшы працуе механізатарам: на жніве не менш адказная пасада. Я ж перавожу сабраны ўраджай.

Ужо каторы год, нягледзячы на пагоны, Сяргей Свірскі ў гэты перыяд — на палетках. Пяць разоў запар удзельнічаў ва ўборцы ўраджаю ў Віцебскай вобласці, прычым у адным калгасе. Сёлета дапамагае аграрыям агракамбіната «Ждановічы». Прычым не толькі ва ўборцы збожжа. На даверанымі яму аўтамабілі перавозіць і салому, і кармы.

— Наша гаспадарка адна з найбуйнейшых у краіне, таму дапамога, якую аказваюць вайскоўцы, нам вельмі неабходная, — расказвае **галоўны інжынер прадпрыемства Уладзімір ПЯКАРЧЫК.** — Міністэрствам абароны выдзелена шэсць аўтамабіляў. У нас хапае і сваёй тэхнікі, але паколькі адлегласці вялікія (ва ўласнасці гаспадаркі — 8200 гектараў на тэрыторыі Мінскага і Дзяржынскага раёнаў), патрэба больш: камбайн чакаць машыну не павінен. Мы вельмі задаволеныя работай ваеннаслужачых: яны працуюць бездакорна. Ніводнай заўвагі!

СТАР. 4

■ Прырода і мы

# КЛІМАТ І ЭКАНОМІКА: ЗМАГАЦЦА ЦІ ПРЫСТАСАВАЦЦА?

## Чым небяспечныя цёплыя зімы і трапічнае лета

**Сёння сусветны клімат змяняецца — і гэта бясспрэчны факт, упэўнены спецыялісты. Ці можна прыстасавацца да гэтых змен або знізіць уплыў негатыўных прыродных фактараў на жыццядзейнасць нашай краіны?**

— Калі прасочваць змяненне тэмпературы на тэрыторыі Беларусі (а першыя інструментальныя назіранні тут былі распачаты яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя), то пачынаючы прыкладна з 1989 года, тэмпература паветра пастаянна расце, — канстатуе **Віктар МЕЛЬНІК, начальнік службы навукова-метадычнага забеспячэння гідраметэаралагічнага і радыяцыйна-экалагічнага маніторынгу і фондаў даных Белгідрамета.** — За гэты час (з 1989 па 2015 гады) у краіне сярэднегадавая тэмпература паветра перавысіла кліматычную норму на 1,3 °С. Гэта значыць, мы жывём у час, калі клімат змяняецца ў бок пацяплення, і пакуль, паводле ацэнак спецыялістаў, гэты працэс будзе працягвацца.

Пацяпленне клімату ў нас праяўляецца праз цёплыя зімы, ранні надыход вясновых працэсаў, павелічэнне працягласці і цеплазабяспечанасці вегетацыйнага перыяду. Разам з тым расце і паўтаральнасць засух, хваль цяпла, высокіх тэмператур паветра, павялічваецца колькасць новых інфекцыйных і паразітарных хвароб, лясных пажараў і інш. Усё гэта істотна ўплывае на дзейнасць розных сфер эканомікі краіны.

Па ацэнках экспертаў Сусветнага банка (2005 г.), штогадовая страта ад уздзеяння небяспечных гідраметэаралагічных з'яў на тэрыторыі Беларусі складае каля 90 млн долараў. З іх на сельскую гаспадарку прыпадае 42%, паліўна-энергетычны комплекс — 19%, будаўніцтва — 12%.

СТАР. 7

# МАЛАДАЯ ДЫНАМІКА СТАРАЖЫТНАГА ГОРАДА

## Кіраўнік дзяржавы наведаў Брэст з рабочым візітам

**Праз два гады — у 2019-м — Брэст адсвяткуе сваё 1000-годдзе. Да святочнай даты горад рыхтуецца грунтоўна. Поўным ходам ідзе капітальны рамонт жылога фонду, узводзіцца аўтавакзал па вуліцы Арджанікідзэ, рэканструюецца пуцеправод, будуецца новы мікраён. Менавіта яго ўчора першым наведаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць.**

### У перспектыве — зарплата ў 1500 рублёў

Эканоміка Брэста дазваляе фарміраваць гарадскі бюджэт самадастаткова. На цяперашні момант сярэдняя заробатная плата складае тут 820 рублёў. На неабходную 1000 па выніках года плануюць выйсці. Прэзідэнт паставіў больш глабальную задачу:

— Ёсць прадпрыемствы, якія сярэднюю зарплату цягнуць уверх. Але ёсць жа палова, можа недзе трошкі менш, прадпрыемстваў, дзе мы не дацягваем да гэтага ўзроўню і ўвогуле зарплата невялікая. Таму ў 2018—2019 гадах мы бяромся за тых, хто мала зарабляе. Каб мы ў 2018 годзе іх падцягнулі ўжо да 500 долараў — да 1000 рублёў. Ну і за кошт іх, і тых, хто ўжо дасягнуў гэтай лічбы, мы будзем мець паўтары тысячы рублёў у сярэднім.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сацыяльныя работнікі, работнікі сферы культуры, як правіла, атрымліваюць невысокую зарплату. За наступны год гэта сітуацыя павінна быць выпраўлена.

— А цяпер нам трэба застаўбіцца на сярэдняй зарплаце. Каб не атрымалася: у снежні выплаты, даплаты, а ў студзені зноў упадзе. Ні ў якім разе гэтага дапусціць нельга, — папярэдзіў Прэзідэнт.

### Без класа беспрацоўных

Традыцыйна кіраўнік дзяржавы спыніўся на тэме занятасці. Ён пацікавіўся сітуацыяй з працоўнымі месцамі ў Брэсце, занятасцю ў цэлым. Яму расказалі, што складана знайсці людзей на такія вакансіі, як швачка, шафёр. Найбольшым жа попытам у саіскальнікаў карыстаецца вакансія вартаўніка «два праз два» (калі два працоўныя дні чаргуюцца з двума выхаднымі).

— Пытанне ў тым, што мы павінны прымусіць усіх працаваць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Безумоўна, будзе нейкі маленькі працэнт людзей, якія ні на што не здольныя. Хапае ў нас, на жаль, алкаголікаў... Ну як іх прымусіць працаваць? Спецыфічнымі метадамі будзем прымушаць. Але ёсць людзі, якія могуць, але ўхіляюцца.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што з гэтай сітуацыі знойдзецца выхад:

— Гэтых людзей трэба ставіць у такія ўмовы, каб яны ўсё-такі ішлі працаваць... Людзей трэба прывучаць працаваць. Нельга ствараць так званы клас беспрацоўных.

### Падарунак на 1000-годдзе

Кіраўнік дзяржавы пазнаёміўся з ходам будаўніцтва Заходняга абходу Брэста. У абласным цэнтры гэта адзін з самых маштабных праектаў. Дзякуючы яму будуць аптымізаваны транспартныя патокі паміж левым і правым берагамі ракі Мухавец, а ў перспектыве Заходні абход Брэста злучыць дзве трасы: Брэст — мяжа Украіны і Брэст — Мінск — мяжа Расіі. Пажаданне Прэзідэнта: усё павінна быць прыгожа і функцыянальна. Так, паабапал пуцеправода можна высадзіць дрэвы, пасеяць газон, а знізу — пабудаваць паркоўку.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на тое, што падчас будаўніцтва магістралі павінны выконвацца правы мясцовых жыхароў. Тыя людзі, чые дамы пападаюць пад знос, узамен павінны атрымаць годнае жыллё.

Праект па будаўніцтве Заходняга абходу Брэста плануюць рэалізаваць да 1000-годдзя горада.

### Малочны лідар

Ці не самым цікавым аб'ектам, які ўчора наведаў Аляксандр Лукашэнка, стала прадпрыемства «Савушкін прадукт». Яго прадукцыі, відаць, і рэклама не патрэбная. Прынамсі, тавары пад гэтай маркай можна адшукаць, без перабольшвання, у кожным халадзільніку. Прэзідэнт пагладзеў, як робіцца тварог і прадэгуставаў розныя ўзоры прадукцыі прадпрыемства. Фінальны акорд — уручэнне кампаніі Ганаровага дзяржаўнага сцяга *(на фота)*.

Як адзначыў Прэзідэнт, гэта не толькі знак высокага прызнання заслуг усяго калектыву, але і «паказчык той народнай любові, якую змог заваяваць «Савушкін прадукт»:

— Дзякуючы шырокаму асартыменту і выдатнай якасці тавары пад гэтым брэндам здабылі папулярнасць не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі. Іх ахвотна купляюць у Расіі, Украіне, краінах Еўразаюза, Кітаі, Сінгапуры, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Паўднёвай Карэі, Ізраілі і многіх іншых дзяржавах. Толькі летась аб'ём экспарту склаў больш за 210 мільёнаў долараў.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: поспехі прадпрыемства не выпадковыя. Яны з'яўляюцца яркім адлюстраваннем мэтанакіраванай палітыкі, якую праводзіць дзяржава ў аграпрамысловым сектары.

— У краіне здзейснены пераход ад канцэпцыі развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці да канцэпцыі развіцця сельскай мясцовасці ў цэлым, — звярнуў увагу Прэзідэнт Беларусі. — Гэта дазволіла адрадзіць беларускую вёску з яе эканамічным патэнцыялам.

Сёння па выпуску абсалютнай большасці відаў сельскагаспадарчай прадукцыі на душу насельніцтва Беларусь істотна пераўзыходзіць іншыя краіны Садружнасці Незалежных Дзяржаў. А па вытворчасці малака апярэджвае такія развітыя краіны, як Нідэрланды, Германія, Францыя.

— У харчовых адносінах краіна стала не толькі самадастатковай, але і экспартаарыентаванай, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Аб'ём рэалізаванай за мяжу харчовай прадукцыі ў 2016 годзе перавысіў чатыры мільярды долараў. У цяперашні час па некаторых пазіцыях, напрыклад, па экспарце сметанковага масла, тварагу, абястлушчанага малака, мы ўвайшлі ў лік сусветных лідараў.

### Вынікі мадэрнізацыі

Што да ўнутранага рынку, то ён даўно насычаны айчыннымі прадуктамі харчавання, якія, дзякуючы высокай якасці і даступнасці, паспяхова канкурыруюць з імпартнымі аналагамі. На думку кіраўніка краіны, у многім тут мы бачым вынікі своечасова праведзенай мадэрнізацыі:

— Уклаўшы значныя сродкі ў мадэрнізацыю перапрацоўчай прамысловасці, мы сталі атрымліваць салідную аддачу. У гэтым сегменце эканомікі з'явілася шмат кампаній з сучасным тэхналагічным укладам. Яны дэманструюць высокую культуру вытворчасці, праяўляюць гнуткасць, клапоцяцца пра сыравінную базу, укладваюць грошы ва ўласнае развіццё, забяспечваюць сваім супрацоўнікам годны сацыяльны пакет, узводзяць для іх жыллё.

Так, прадпрыемствы, якія раней мелі патрэбу ў дапамозе дзяржавы, сёння самі сталі лакаматывам шэрагу галін і візітнай карткай Беларусі.

— Як нельга лепш гэта характарызуецца падыходзіць да акцыянернага таварыства «Савушкін прадукт» — флагмана малочнай прамысловасці краіны, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — За апошнія дзесяць гадоў кампанія накіравала на пашырэнне і мадэрнізацыю сваёй вытворчасці амаль 300 мільёнаў долараў. Важна, што грошы ідуць не толькі на тэхнічнае аснашчэнне і будаўніцтва новых вытворчых аб'ектаў, але і на ўмацаванне сыравіннай базы.

Кампанія пашырае свае вытворчыя магутнасці, набываючы спецыялізаваныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, рэканструюючы жывёлагадоўчыя комплексы, абнаўляючы дойны статак.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*
*г. Брэст.*



Фота БЕЛТА.

### У тэму

**Аляксандр САЎЧЫЦ, генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт»:**

— За апошнае дзесяцігоддзе сапраўды зроблена вельмі многае. Калі параўноўваць 2007 год і цяперашні, то мы павялічылі продажы ў пяць разоў, вытворчасць — у чатыры, колькасць работнікаў — удвая. Мы насамрэч пераўтвараліся ў флагмана малочнай галіны Рэспублікі Беларусь. Гэта ацэнка Прэзідэнта.

## Навесці элементарны парадак

**Сітуацыя на праблемным камунальным унітарным сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Глыбачаны» ва Ушацкім раёне будзе ўзята пад жорсткі кантроль. Пра гэта заявіла ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА па выніках наведвання згаданага прадпрыемства.**

«Сказаць, што гэта праблемная гаспадарка, значыць, не сказаць нічога. Сапраўды, сітуацыя вельмі складаная, нягледзячы на тое, што тут няма праблем з палівам, ёсць дзве зернесушылкі, гаспадарка ўкамплектавана механізатарамі, хоць 50% — гэта прыцягнутыя людзі з іншых арганізацый. Разам з тым тут абсалютна няма культуры вытворчасці, усё ў занядбаным стане», — канстатавала Наталля Качанава, падкрэсліўшы, што ў «Глыбачанах» у першую чаргу неабходна навесці элементарны парадак. Тады, паводле яе слоў, у людзей будзе больш жадання і імкнення працаваць на выніх.

Адказваючы на пытанне, ці будзе яна і далей наведваць падобныя праблемныя сельгаспрадпрыемствы, Наталля Качанава адказала: «Адназначна». У прыватнасці, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта нагадала, што Аляксандр Лукашэнка на селектарнай нарадзе выразна паставіў задачу: кіраўнік раёна павінен займацца перш за ўсё такімі праблемнымі прадпрыемствамі. Добрыя прадпрыемствы працуюць якасна, там моцныя кіраўнікі. «І такіх шмат у нас па краіне. Я была ў Брэсцкай вобласці, бачыла такія прадпрыемствы, дзе і культура вытворчасці, і чысціня, і парадак, і добрыя палі. Трэба займацца менавіта такімі праблемнымі прадпрыемствамі», — рэзюмавала яна, дадаўшы, што сітуацыя ў «Глыбачанах» будзе выпраўлена.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Прэм'ер Камбоджы запатрабаваў ад ваенных Лаоса пакінуць тэрыторыю краіны

Прэм'ер-міністр Камбоджы Хун Сен абвінаваціў суседнюю дзяржаву Лаос у ваенным уварванні. Як расказаў Reuters чыноўнік у пасольстве Лаоса ў Пнампені, у краін ёсць спрэчка з нагоды тэрыторыі і ўстанаўлення меж. Хун Сен назваў 17 жніўня апошнім тэрмінам для вываду замежных ваенных, прыстрашыўшы ў адваротным выпадку адправіць войска ў прыгранічную тэрыторыю. Прэм'ер Камбоджы, выступаючы ў сталіцы каралеўства Пнампені, паведаміў, што звязаўся з урадам Лаоса з нагоды 30 лаоскіх салдат, якія перасеклі мяжу. «У мяне больш няма цярпення», — сказаў Хун Сен.

### «Яечны крызіс» закрануў не менш за дзесяць краін Еўрасаюза

Дзесяць з 28 краін — членаў Еўрасаюза апынуліся закранутымі так званым яечным крызісам, які ўзнік з-за паступлення ў гандлёвыя сеткі заражаных інсектыцыдам фіпраніл курыных яек. «Аб канфіскацыі яек з продажу інфармавалі Бельгія, Нідэрланды, Германія, Швецыя, Вялікабрытанія, Францыя, Люксембург, Данія, Славакія і Румынія, а таксама Швейцарыя», — паведамілі ў Еўракамісіі. Еўракамісар па пытаннях харчовай бяспекі Вітэніс Андрыўкайціс абвясціў аб намеры склікаць да канца верасня сустрэчу профільных міністраў краін ЕС і прадстаўнікоў нацыянальных кантрольных органаў у сувязі з «яечным крызісам» пасля таго, як будуць устаноўлены яго прычыны і вінаватыя фізічныя і юрыдычныя асобы.

### Пажар адбыўся ў цягніку лонданскага метро

Гэта здарылася ў раёне станцыі Oxford Circus лініі Бейкерлоа. Станцыя была закрыта, рух спынены. На месца прыбылі пажарныя і транспартная паліцыя. Адзначалася, што прычына пажару не разглядалася як падазроная. Пажарная брыгада патушыла ўзгаранне. Ідзе расследаванне прычыны інцыдэнту. «Мы аказалі дапамогу на месцы чатыром пацыентам, якія атруціліся дымам, двух з іх мы забралі ў бальніцу ў якасці меры перасцярогі», — паведаміла хуткая дапамога Лондана.

### Навукоўцы назвалі мінулы год самым цёплым у гісторыі



Амерыканскае метэаралагічнае таварыства апублікавала даклад аб стане глабальнага клімату Зямлі летась, з якога вынікае, што 2016 год стаў самым цёплым у гісторыі назіранняў. Паведамляецца, што справаздача заснавана на даных спецыялістаў з усяго свету (больш за 450 навукоўцаў з амаль 60 краін). «Рэкордная цеплыня мінулага года стала вынікам сумеснага ўплыву доўгатэрміновага глабальнага пацяплення і моцнага ўздзеяння Эль-Ніньё (з'ява, якая ўяўляе сабой ваганні тэмпературы паверхоўнага пласта вады ў экватарыяльнай частцы Ціхага акіяна) у пачатку года», — сказана ў справаздачы. Па інфармацыі навукоўцаў, агульная глабальная тэмпература паверхні сушы і акіяна летась працягнула біць рэкорды ўжо трэці год запар.

■ Сфера інтарэсаў

# Работа над іміджам. Касмічным...

**Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў сустрэўся з касманаўтам Алегам Навіцкім. У перамовах прынялі ўдзел таксама кіраўнік апарату НАН Беларусі Пётр Віцязь і дырэктар Навукова-інжынернага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы» НАН Беларусі, галоўны канструктар Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі Сяргей Залаты.**




**Касманаўт Алег НАВІЦКІ азнаёміўся з экспазіцыяй Музея гісторыі НАН Беларусі і пастаянна дзеючай выстаўкай «Дасягненні айчыннай навукі — вытворчасці».**

Тэмай перамоў з расійскім касманаўтам, ураджэнцам беларускага горада Чэрвеня, стала падрыхтоўка да правядзення 31-га Міжнароднага кангрэса Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, які пройдзе ў Беларусі ў верасні 2018 года, а таксама ўдзел у гэтым форуме расійскіх касманаўтаў.

— Мы надаём асаблівае значэнне правядзенню касмічнага кангрэса ў Беларусі, — падкрэсліў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**. — Гэтае мерапрыемства адыгрывае важную ролю ва ўмацаванні іміджу Беларусі як касмічнай дзяржавы.

Уладзімір Гусакоў азнаёміў Алега Навіцкага з дасягненнямі Беларусі ў касмічнай сферы. Пасля запуску ў ліпені 2012 года Беларускага касмічнага апарата сумесна з расійскім касмічным апаратам «Канопус-В» наша краіна ўвайшла ў лік сусветных касмічных дзяржаў. На 68-й сесіі Генасамблеі ААН 1 лістапада 2013 года Беларусь была прынятая ў члены Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах.

Уладзімір Гусакоў расказаў, што ў цяперашні час Беларусь і Расія прыступілі да стварэння новага расійска-беларускага касмічнага апарата звышвысокага раздзялення (РБКА). Сукупнасць яго тэхнічных характарыстык дасць магчымасць атрымліваць касмічныя здымкі з параметрамі, якія на сусветным рынку яшчэ адсутнічаюць, што гарантуе попыт на выраб такіх касмічных апаратаў. Можна казаць аб серыйнай іх вытворчасці. Акрамя таго, новыя магчымасці з'яўляюцца ў карыстальнікаў касмічнай інфармацыі, рэальнасцю становяцца лічбавыя кадастравыя мадэлі буйных гарадоў, іншыя высокатэхналагічныя інфармацыйныя праграмы, істотна павышаецца ўзровень вырашэння задач, скіраваных на павышэнне абараназдольнасці і бяспекі Беларусі і Саюзнай дзяржавы.

Міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, які пройдзе ў Беларусі ў верасні 2018 года, збярэ дэлегатаў (касманаўтаў, астранаўтаў, прадстаўнікоў навукова-даследчых устаноў і нацыянальных касмічных агенцтваў) больш чым з 30 краін. Як чакаецца, мерапрыемствы кангрэса будуць доўжыцца на працягу тыдня. Дэлегатам прапануюць наведаць некалькі інстытутаў НАН Беларусі і азнаёміцца з дасягненнямі нашай краіны ў касмічнай сферы. Касманаўт Алег Навіцкі паабяцаў прыняць удзел у 31-м Міжнародным кангрэсе Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў у Мінску.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Па-за спортам

# ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА Ў СУДЗЕ ЗМАГАЕЦЦА ЗА СЫНА

**Тэнісістка трапіла ў няпростую жыццёвую сітуацыю. Год таму спартсменка абвясціла, што чакае дзіця, а яго бацькам з'яўляецца Білі Маккіг, адносіны з якім афіцыйна былі не зарэгістраваныя. У ліпені 2017-га пара распалася, Маккіг з'ехаў у Беверлі-Хілз і падаў у суд, дзе заявіў, што занепакоены выкраданнем дзіцяці. Суд пастанавіў, што Леа-Аляксандр павінен быць вернуты ў Лос-Анджэлес і на час разгляду справы аб апякунстве не можа пакідаць горад.**

Разам з мясцовымі юрыстамі, якія прадстаўляюць тэнісістку, Вікторыя звярнулася да ізраільскага адваката Зіва Вальнэра, аднаго з найлепшых спецыялістаў у галіне сямейнага права. Мяркуецца, што суд будзе доўжыцца мінімум да кастрычніка. А гэта азначае, што Азаранка будзе вымушана прапусціць US Open (які стартуе 28 жніўня) ці адмовіцца ад зносін з сынам на час турніру.

Адвакат тэнісісткі паведаміў, што Азаранка прапанавала аплаціць Білі Маккігу праезд і пражыванне падчас US Open, але суддзя адказаў адмовай. Акрамя таго, суд у Лос-Анджэлесе не збіраецца перадаваць гэтую справу на разгляд у Беларусь, на што разлічвала Вікторыя. Адзначым, што з Беларусі паступіла заяўка на апякунства над Леа, якая была сапраўднай, бо бацькі дзіцяці маюць грамадзянства краіны, але з невядомых прычын суддзя адмовіўся перадаваць справу ў беларускі суд.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «Тут усё і ўсе мне знаёмыя»

Калі ёсць у «Звяздзы» падпісчык са стажам, дык гэта, мусіць, я. Газету выпісваю і чытаю з 1960 года. У «Звяздзе» цікавага шмат. Тут усё і ўсе мне знаёмыя. Люблю артыкулы Валянціны Доўнар, вельмі рада, што на старонках зноў з'явілася імя Алена Ляўковіч.

Не магу не згадаць, як газета праводзіла конкурс прыпевак. Адну з іх помню па сённяшні дзень, бо вельмі ж яна справядлівая:

*У настаўніка Пятрова*
*Цэлы год няма абновы.*
*Былы двоечнік-балбес*
*Змяніў трэці мерседэс.*

...Шчыры дзякуй усім журналістам стагадовай газеты за іх нялёгкую працу і цікавыя артыкулы, за «...Народ на праваздзе!». Яго я таксама збіраю і часам перачытваю. Пішыце больш пра здароўе, пра сад і гарод, пра наша мінулае, разыгрывайце прызы, бо ў многіх вашых падпісчыкаў стаж вялікі (у мяне больш за сорак гадоў). Асобная просьба — шануйце мову. Я люблю яе слухаць, люблю на ёй чытаць і таму выбіраю «Звязду».

**Вера Яфімаўна Клімовіч,**
*в. Сцяцкі, Стаўбцоўскі раён.*

■ Святкуем

# БЛАКІТНАЯ КРЫНІЦА ЗАПРАШАЕ

**Мядовы Спас, Спас на вадзе, Спасаўка, Макавей, Ласаўка, Мядовае, або Пчаліные свята — назвы першага Спаса, які праваслаўныя адзначаюць 14 жніўня. Слаўгарад запрашае адзначыць яго на адной з унікальных крыніц Беларусі — Блакітнай.**

Ужо сёння тут пачне працаваць кірмаш, дзе можна пакаштаваць свежага мядку і смачнага самаробнага сыру, ацаніць вырабы народных умельцаў. Арганізатары абяцаюць насычаную культурную і спартыўную праграму. Будзе арганізаваны пракат байдарак і веласіпедаў, запрацуюць дзіцячыя атракцыёны. Тут чакаюць шмат паломнікаў, якія прымуць удзел у вячэрнім і ранішнім богаслужэнні. Кульмінацыяй слаўгарадскага Макавея стане чацвёртае рэгіянальнае свята-конкурс «Спас — усяму час» з удзелам творчых калектываў Магілёўскай і іншых абласцей. У нядзелю і панядзелак будзе наладжаны рэгулярны рух аўтобусаў па маршруце Слаўгарад — Блакітная крыніца, 14 жніўня транспарт будзе курсіраваць кожную гадзіну, пачынаючы з 9.00 і да 16.00.

Нагадаем, што Блакітная крыніца існавала яшчэ да Хрышчэння Русі. Тут радзімічы праводзілі свае магічныя рытуалы і пакланяліся славянскім багам. Пасля перамогі вады Уладзіміра Чырвонае Сонейка — Воўчага Хваста над свавольным племем, тут адбылося хрышчэнне радзімічаў. Старыя людзі кажуць, што гэта месца асаблівае, бо тут на працягу некалькіх стагоддзяў гучалі словы малітвы.

У праваслаўі Мядовы Спас гэта яшчэ і пачатак кароткага, але вельмі строгага Успенскага посту, які будзе доўжыцца да 28 жніўня.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Навука і тэхніка

# ПАДУШКА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

## Як тэхналогіі абараняюць пешаходаў ад аварыйных сітуацый

**Бяспека пешаходаў з'яўляецца вельмі важным аспектам для аўтавытворцаў. У сучасных аўтамабілях выкарыстоўваюцца тэхналогіі, якія здольныя самастойна спыніць машыну пры выяўленні перашкоды. Аднак штучны інтэлект не ідэальны: аварыі ўсё яшчэ здараюцца, прычым у немалых колькасцях. Але ў хуткім часе ўсё можа змяніцца: кампанія «Daimler» запатэнтавала тэхналогію, якая дапаможа выратаваць многіх пешаходаў.**

Дакумент нямецкага аўтагіганта, які вырабляе аўтамабілі такіх марак, як «Mercedes» і «Smart», на днях быў апублікаваны патэнтным ведамствам ЗША. Сам патэнт быў заяўлены яшчэ два гады таму, аднак пацверджаны толькі цяпер. У дакуменце апісваюцца так званыя пешаходныя падушкі бяспекі, якія дапамогуць значна знізіць ступень пашкоджання пешахода.

Сутнасць тэхналогіі заключаецца ў тым, што пры лабавым сутыкненні за долі секунды капот аўтамабіля падымаецца і зрушваецца, такім чынам закрываючы ніжнюю частку шкла і «дворнікі». Адначасова з гэтым ўздоўж пярэдніх стоек раскрываюцца падушкі бяспекі, прымацаваныя да самога капота. У тэхналогіі выкарыстоўваюцца піратапатроны — вырабы, якія неабходны для хуткага прывядзення ў дзеянне пэўнага механізма, у гэтым выпадку — падушак бяспекі. У выніку чалавек уразаецца ў капот, частка якога і з'яўляецца імправізаванай падушкай.

Чаму такая тэхналогія не з'явілася ва ўсіх аўтамабілях раней, каб абараніць пешаходу? Праблема заключаецца ў тым, што яна надзвычай дарагая. Нягледзячы на высокі кошт, пешаходныя падушкі бяспекі з'явіліся ў такіх аўтамабілях, як «Land Rover Discovery Sport», «Subaru Impreza» і «Jaguar E-Pace». Такім чынам, у «Daimler» з'явілася таннейшая тэхналогія, якая рэальна можа выкарыстоўвацца ва ўсіх аўтамабілях кампаніі.

Сама ідэя не з'яўляецца новай, аднак «Daimler» прапаноўвае альтэрнатыўны варыянт яе выкарыстання: нямецкія спецыялісты адмовіліся ад вялікага надзімаднага мяшка, размясціўшы самі падушкі ўздоўж стоек. Упершыню такое рашэнне прапанавала кампанія «Volvo» яшчэ ў 2012 годзе на сваёй мадэлі V40. Ужо тады гэтая сістэма ўзаемадзейнічала са штучным інтэлектам, які адказваў за выяўленне пешаходаў. Па статыстыцы, 75% дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам пешаходаў адбываюцца на хуткасці да 40 км/г, таму тэхналогія працавала ў аўтаматычным рэжыме на хуткасці ад 20 да 50 км/г.

Цікава тое, што з 2010 года «Volvo» належыць кампаніі «Geely Automobile Holdings Limited», прадстаўнікі якой пазней падпісалі мемарандум з Міністэрствам прамысловасці Беларусі, на падставе якога было створана сумеснае беларуска-кітайскае прадпрыемства «БелДжы». Па словах **вядучага інжынера-тэхнолага кампаніі Дзмітрыя ПЯТРОВІЧА**, калі кампанія «Volvo» прапануе пераняць тэхналогію падушак бяспекі для пешаходаў, то «БелДжы» разгледзіць такі варыянт. «Гэта не будзе праблемай. Але гэтая тэхналогія каштуе сапраўды дорага для беларускага рынку. Нашы аўтамабілі павінны заваёўваць рынак якасцю і коштам хоць бы на першым этапе, а такая тэхналогія значна павялічыць кошт аўтамабіля», — заўважыў Дзмітрый Пятровіч.




**Такім чынам гэтая тэхналогія была рэалізавана ў 2012 годзе. Пасля сутыкнення пешаходы часта ўдараюцца аб капот і лабавое шкло, а падушка бяспекі памяншае ступень пашкоджання. Крыніца ілюстрацыі — «Volvo».**

— На цяперашні момант укараненне такой тэхналогіі ў аўтамабілі «Geely» не абмяркоўвалася. Цяпер такога не будзе, магчыма, толькі ў будучыні, — дадаў спецыяліст. — Нас вельмі хвалюе бяспека пешаходаў. Мы працуем па кітайскіх тэхналогіях, але ў іх пакуль такой ідэі няма. Адпаведна, на нашым заводзе мы гэта не рэалізуем. Дарэчы, нашы мадэлі маюць сапраўды высокія адзнакі па бяспецы.

Сёння наезд на пешаходаў — гэта значная праблема, што пацвярджаюць і ў ДАІ. «Напрыклад, з пачатку года ў Мінску зарэгістравана 243 дарожна-транспартныя здарэнні, з якіх 105 — гэта наезды на пешаходаў. Гэта практычна палова ДТЗ, якія адбываюцца ў сталіцы, — адзначыла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Кастрычніцкага РУУС Мінска Вікторыя ЦАРУК**. — Пешаходы — гэта самыя неабароненыя ўдзельнікі дарожнага руху, таму супрацоўнікі ДАІ падтрымліваюць такое новаўвядзенне, як падушкі бяспекі для пешаходаў, паколькі стане менш цяжкіх пашкоджанняў».

Аднак пра бяспеку павінны думаць не толькі аўтавытворцы, але і самі пешаходы, упэўнена старшы інспектар. «Яны з'яўляюцца такімі ж удзельнікамі дарожнага руху, як і кіроўцы. Існуюць правілы дарожнага руху, якія пешаходы звычайна пачынаюць вывучаць у тым выпадку, калі з імі нешта здараецца, а так быць не павінна. Таму пешаходам не парашкодзіць ведаць правілы, якія датычацца непасрэдна іх», — дадала Вікторыя Царук.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

# ХЛЕБАРОБЫ Ў ПАГОНАХ





Камбайнерам Віктару ПЯТРОВІЧУ і Віталю ЛЕПСКАМУ ўжо цяжка і ўспомніць, якое гэтае жніва для іх па ліку.

## Кіламетры вопыту

Па словах **начальніка ўчастка «Чачкава» агракамбіната «Ждановічы» Пятра НАВУМЧЫКА**, з-за дажджлівага надвор'я першыя камбайны выйшлі ў поле толькі 1 жніўня, таму, каб наверстаць упушчанае, працуюць і днём, і ноччу, без выхадных. «На цяперашні момант (на раніцу 10 жніўня. — **Аўт.**) убрана 30% ураджаю, — удакладняе аграрый. — Ураджайнасць на ўзроўні мінулага года — у сярэднім 60 цэнтнераў на гектар. Паколькі ў пачатку лета было холадна, а потым увогуле залівала, мы на такія лічбы нават не разлічвалі. Не паспеем сабраць збожжа, як пачнём капаць бульбу. Год у нас заканчваецца 31 снежня. Новы пачынаецца адразу ж на наступны дзень. Адпачываць няма калі: як толькі ўсё сабраў, трэба закладваць новы ўраджай».

Нягледзячы на малады ўзрост, радавы кантрактнай службы Дзяніс Цыцуля ўжо не раз удзельнічаў у жніве. Вядома, такіх сучасных і вялікіх машын, адной з якіх ён кіруе, у гаспадарцы, што ў Клецкім раёне (а менавіта адтуль родам хлопец), не было.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Старшына кантрактнай службы Сяргей СВІРСКІ за рулём ужо больш як 25 гадоў.**

— Мой самазвал, напрыклад, умяшчае каля 30 тон зерня, — гаворыць Дзяніс. — За дзень робім па чатырыпяць рэйсаў. З кожным кіламетрам набіраешся вопыту.

Пакуль размаўлялі, вайскоўцу павядамілі, што на полі... яго бацькі. Аказваецца, Галіна Іванаўна і Іван Ціліпавіч, будучы па ўласных справах у Мінску, не маглі не павітацца з адзіным сынам. «Даўно не бачыліся, — прызнаюцца бацькі. — Ён сам з вёскі, таму ведае гэтую работу добра. Вельмі ганарымся, што наш сын таксама ўносіць свой уклад у такую важную справу, як збор ураджаю».

...Раптоўна на поле заварочвае невялічкі аўтамабільчык. Глушаць маторы камбайны, спыняюцца грузавікі — вячэру прывезлі.

— Сёння будзем сілкавацца бульбяным пюрэ, смажанай рыбай, сырнікамі, памідорамі і кісялём, — расказвае Марына Капойка, якая прывозіць хлебаробам яшчэ і абеды, таксама забяспечвае іх ссабойкамі. — Кожны дзень — у нас новае меню. Трэба ж, каб хлебаробы былі задаволены: нездарма ж кажуць, як падсілкуешся, так і папрацуеш!

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**
*Мінскі раён.*





■ Не без здарэнняў

# ЗБОЖЖА НА КОЛАХ

**Нельга проста так узяць і абысціся без здарэнняў падчас жніва. Так ці інакш усё роўна знойдуцца «прадпрымальныя» людзі, якія захочуць знайсці «ўнікальныя магчымасці» і, яшчэ самі таго не чакаючы, паспець праверыць на пільнасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.**

Так, напярэдадні праваахоўнікі ў Магілёўскім раёне прадухілілі крадзеж каля 20 тон збожжа. Паводле інфармацыі УУС Магілёўскага аблвыканкама, спроба крадзяжу адбылася 9 жніўня ў вёсцы Махава. Адзін з мясцовых кіраўнікоў вывез са збожжатоку 19,4 тоны фуражнай пшаніцы на суму больш за 4 тысячы рублёў. Паводле інфармацыі аператыўнікаў, устаноўлена, што мужчына ўступіў у змову з індывідуальным прадпрымальнікам з Быхава. Пры гэтым пшаніца, якая пакідала зернесушыльны комплекс прадпрыемства, не была адлюстравана ў бухгалтарскім уліку. Праваахоўнікі своечасова спынілі злачынную задуму, і збожжа было вернута ў родную гаспадарку.

Па матэрыялах, сабраных супрацоўнікамі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, следчымі ўзбуджана крымінальная справа па ч. 2 арт. 210 КК (крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі). Кропку ў справе, як заўсёды, паставіць суд, і калі віна падазраваных будзе даказаная, іх чакае пазбаўленне волі ад 2 да 5 гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*



# АД РАНКУ ДА ЗОЛКУ

## Карэспандэнт «Звязды» даведалася, наколькі будучы ўраджай залежыць ад дзеянняў агранома

**І ўсё ж такі несправядліва лічыць героямі жніва толькі камбайнераў ды кіроўцаў, кожная тысяча намалочанага або перавезенага збожжа якіх сёння ўспрымаецца як подзвіг. Яны, вядома, героі, але ёсць яшчэ і байцы нябачнага фронту. Напрыклад, аграномы, якія ў гэтыя гарачыя дні каардынуюць і рэгулююць працэс усіх без выключэння сельскагаспадарчых работ. Пасля сумеснага працоўнага дня з галоўным аграномам СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна Аляксандрам Лейбуціным кажу з поўнай адказнасцю: ад кваліфікаваных дзеянняў гэтых спецыялістаў шмат што залежыць.**

### НІ ХВІЛІНЫ ПАКОЮ

Працоўны дзень летам у агранома пачынаецца рана. А 7-й гадзіне ўжо планёрка на машынным двары, дзе збіраюцца ўсе спецыялісты. Вызначаюцца аб'ём і маштаб работы з улікам надвор'я, размяркоўваецца тэхніка, выпісваюцца пуцёўкі. Механізатары забіраюць гэтыя лісты, спецыялісты тлумачаць ім, што рабіць.

— Мне трэба арганізаваць работу так, каб працэс ішоў, як той казаў, без сучка і задзірынкі, — кажа галоўны аграном. — Неабходна кожнаму растлумачыць, каб усё было зроблена правільна, а потым і пракантраляваць. З поля іду амаль апошні, пасля 8 гадзін вечара. А ў галаве ўжо прыкідваю, які аб'ём работ на наступны дзень запланаваць. І так — з сакавіка па кастрычнік, пакуль усё на палетках не ўбярэцца. У адпачынак мы ходзім у асноўным толькі ў снежні або студзені.

Зараз усе сілы кінуты на жніво. Але акрамя гэтага, на плошчах гаспадаркі поўнай хадой ідзе ўборка саломы, унясенне ўгнаенняў, падрыхтоўка глебы да сяўбы азімых.

Перш-наперш едзем паглядзець, што адбываецца на полі каля вёскі Ермалавічы. Там скасілі на сянаж шматгадовыя травы і рыхтуюць участак пад азімы рапс. Механізатар Сяргей Гаўрыленка на трактары МТЗ 3022 ушчыльняе глебу, каб пасля зімы яна не асела і не пашкодзіла каранёвую сістэму расліны. А яго калега Аляксандр Фралоў на яшчэ адным трактары раскідвае па полі азотныя ўгнаенні.

— Сёлета ўсё зацягнута, уборка пачалася на тыдзень пазней, і зараз трэба спяшацца, каб укласціся ў тэрміны, — тлумачыць галоўны аграном.

Пасля кароткіх перамоў з трактарыстамі накіроўваемся ў бок вёскі Рафалава, дзе ўжо сабрана збожжа і ідзе прасаванне саломы. Час ад часу прыходзіцца перарываць гаворку, каб галоўны аграном адказаў на чарговы тэлефонны званок.

У адной руцэ руль, у другой мабільны тэлефон — вось так і імчым з Аляксандрам Лейбуціным па прасёлачных дарогах, падскокваючы на ўхабах, ад аднаго пункта да другога. Калгасная гаспадарка вялікая, раскінулася на землях ажно чатырох былых калгасаў, амаль 7,5 тысячы гектараў раллі, адных толькі фермаў — восем штук. А трэба быць адначасова ўсюды. За дзень галоўны аграном накручвае на сваім «жыгулёнку» каля 200 кіламетраў.



Як паеў, так і папрацаваў.

### ДОБРЫ АГРАНОМ — НА ВАГУ ЗОЛАТА

Аляксандр Лейбуцін працуе ў «Радзіме» шосты год. Прыехаў сюды па запрашэнні кіраўніка гаспадаркі з Касцюковіцкага раёна. Адразу ж забяспечылі жыллём, далі службовы аўтамабіль, годны заробак. Прафесія агранома вельмі адказная. Беларусь знаходзіцца ў зоне рызыкоўнага земляробства, ураджай вельмі залежыць ад надвор'я. І прамая задача агранома гэту рызыку мінімізаваць: у тэрмін унесці ўгнаенні, зрабіць апрацоўку, паклапаціцца пра тое, каб расліны не пацярпелі ад маразоў, каб зярняты паспяхова перазімавалі і далі добры ўраджай.

— А наколькі ахвотна ідзе ў аграномы моладзь? Ёсць вы на месцы кіраўніка, узялі б на такую адказную работу ўчарашняга выпускніка ВНУ? — спрабую даведацца наколькі вострa сёння стаіць кадравае пытанне.

— Галоўнае, каб у чалавека было жаданне працаваць. Вышэйшую адукацыю можна атрымаць, а прыйсці і наогул не разумець, што трэба рабіць, і нават не імкнуцца ўнікаць у справу. А ёсць людзі, якія не маюць вышэйшай адукацыі, але ў іх ёсць жаданне працаваць і абавязкова — кемлівасць.

У Лейбуціна аграномаўскі стаж больш за 20 гадоў. Работа падабаецца, хоць у школе зусім не марыў пра гэта. «Памятаю свае школьныя сачыненне на тэму, кім вы хочаце стаць, — смяецца ён. — Гэта была сярэдзіна 80-х, і ўсе пісалі, што мараць быць касманаўтамі, адзін я — напісаў, што... кіроўцам. А вось паступіў у сельскагаспадарчую акадэмію, атрымаў спецыяльнасць, папрацаваў і спадабалася. Калі ёсць вынік і атрымліваеш задавальненне ад работы, гэта заўсёды радуе. Цяпер нават не ўяўляю, кім мог бы працаваць, калі б не аграномам. Была справа, змяніў прафесію на прыродаахоўнага інспектара, але хутка зразумеў: гэта не маё. І вярнуўся».

### БУДЗЕМ З КАРМАМІ — БУДЗЕМ З МАЛАКОМ І ХЛЕБАМ

«Калгас «Радзіма» ў раслінаводстве спецыялізуецца на вырошчванні элітнага насення яравых пшаніцы, ячменю, аўса і гароху, азімых пшаніцы, жыта, трыцікале, яравога і азімага рапсу, вырошчвае на кармы кукурузу і шматгадовыя травы. Кожная культура вельмі важная для гаспадаркі.

Прыпыняемся каля плантацыі з яравым рапсам. Лейбуцін глядзіць, дайшло зерне да кандыцыі ці яшчэ не. Бачна, што аграном задаволены. Стручкі поўныя, але яшчэ зялёныя. Трэба крыху пачакаць.

— Хутка будзем цісніць рапсавае масла і атрымліваць макуху, так званую халву з рапсу. Галоўная для нас менавіта макуха, яна ідзе на корм жывёле для павелічэння бялковага складальніка корму, яго збалансаванасці, — тлумачыць ён.

Гаспадарка мае больш за 9 тысяч галоў жывёлы, з якіх больш за 2 тысячы — дойнага статка. І іх удой залежыць як ад якасці кармоў, так і ад іх колькасці.

— Такога, каб кармоў не хапіла, у нас наогул не бывае, — завярае Аляксандр Лейбуцін. — Пазалеташніх засталося столькі, што яшчэ да будучай вясны хапіла б.



Аляксандр ЛЕЙБУЦІН задаволены ўраджаем.

Наступны наш прыпынак — на нядаўна скошаным полі, дзе тэхніка збірае салому ў акуратныя цюкі. Амаль пастаральны пейзаж: жоўтыя бясконцыя палеткі, зялёныя пералескі і... буслы. Пыл, грукат ад працуючай тэхнікі, а птушкам — хоць бы хны. Нават, калі трактар едзе ледзь не на іх.

— Адзін бусел наогул жыў у нас на машынным двары. Крыло параніў, не мог лятаць. Мы яго падкармлівалі, — кажа галоўны аграном.



Ураджай добры, вось толькі вільготнасць высокая.

Чарговая машына з саломай накіроўваецца ў бок фермы, і мы адпраўляемся следам. Там якраз прыехала перасовачная кухня і людзі снедаюць без адрыву ад вытворчасці.

— На сёння ў нас суп гарохавы і каша рысавая, — рапартуе раздатчыца Іна Васільева і налівае суп кіроўцу Сяргею Мельнікаву. — Асабіста ў мяне 4 кропкі, трэба 20 чалавек накарміць. Наогул такіх кропак у гаспадарцы шмат.

### УРАДЖАЙНАСЦЬ — ЗА 80 ЦЭНТНЕРАЎ З ГЕКТАРА

Нягледзячы на складанае надвор'е, ураджай добры.

— Колас наліўся, зерне буйное, — радуецца інспектар па кадрах Наталля Гарбуз, якая падчас уборачнай вядзе яшчэ і ўлік збожжа. — Ураджайнасць — 65 цэнтнераў з гектара, а месцамі нават і за 80. А летась была ў сярэднім 55.

Адзіная праблема — высокая вільготнасць. На збожжатоку «Усход», куды звозіцца ўраджай з палёў, працуе дзве сушылкі.

Аляксандр Лейбуцін спрабуе зерне на зуб, навобмацак, правярае спецыяльным прыборам. Прыбор паказвае 19,8%. «Вельмі многа, павінна быць не больш за 14%», — тлумачыць спецыяліст. Гэта значыць, што без дадатковай сушкі не абысціся. Толькі потым ачышчанае і высушанае зерне пойдзе на элеватар хлебазавода і часткова — у засекі гаспадаркі. І дзеля таго, каб гэты момант наступіў як мага хутчэй, работнікі «Радзімы» робяць усё магчымае. Тут ужо вынік залежыць не толькі ад намаганняў галоўнага агранома. Але тое, што менавіта механізатары СВК «Калгас «Радзіма» першымі ў Бялыніцкім раёне намалацілі 1000 тон збожжа, сведчыць, што тут кожны чалавек на сваім месцы. Дарэчы, героямі жніва стаў экіпаж Мікалая Дарэчкіна і Валянціна Якушава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

**Алена КАРПЕЧАНКА, намеснік начальніка аддзела камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама:**

— Пра аграномаў кажуць «восень — работ восем». Цяпер яшчэ не восень, але на падыходзе. Для агранома самая што ні на ёсць гарачая пара. Трэба сачыць за тым, каб камбайны не прастойвалі, каб зерне не перагравалася, каб сушкі працавалі, размяркоўваць машыны на адвозцы збожжа, пракантраляваць засыпку насення пад будучую сяўбу, падрыхтоўку глебы для пасеву рапсу. Плюс працягваецца нарыхтоўка кармоў. Ад вопыту і паваротлівасці агранома сёння шмат што залежыць. Вопытны ў нас на вагу золата. Калі яшчэ маладая змена падрасце. СВК «Калгас «Радзіма» — адна з лепшых гаспадарак вобласці. Выдатны кіраўнік, вопытны аграном — і вынікі цудоўныя. Лічбы кажуць самі за сябе. Пры сярэдняй ураджайнасці па вобласці 34,7 ц/га дасягнуць вышэй за 65 ц/га трэба было яшчэ пастарацца.



Збожжа сабралі, чарга за саломай.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Застройщик** – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей от 27.02.2014 №190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а. Тел./факс 204-67-99.

Режим работы – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45 – 16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

Жилой дом №3 по ул. М. Горецкого;
Жилой дом №44 по ул. Ю. Семеняко;
Жилой дом №101 «А» по ул. Одоевского;
Жилой дом №26 по ул. М. Лосика;
Жилой дом №28 по ул. М. Лосика;
Жилой дом №4 по ул. М. Лосика.

Застройщиком получены:

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 24.09.2009;
- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 17.08.2016 №310-15/16;
- решение Мингорисполкома от 08.09.2016 №2599 «Об изъятии и предоставлении земельных участков для строительства объекта, разрешении строительства объекта и инженерных сетей к нему».
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 26.04.2017, от 12.05.2017 №2-208Ж-022/17 на производство строительно-монтажных работ;
- договор строительного подряда с ОАО «МАПИД» от 10.04.2017 № 10/04.

Информация о проекте.

Проектом предусмотрено строительство объекта «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Квартал №2. Жилой дом № 3 по генплану».

Жилой 10-этажный 4-секционный с применением сборных железобетонных изделий серии М464 – У1 с теплым чердаком.

Встроенные помещения товарищества собственников размещены в подвале. В каждой секции размещены: лифт грузоподъемностью 630 кг., мусоропровод.

В жилом доме предусмотрено размещение 160 квартир, в том числе: двухкомнатных – 82; трехкомнатных – 78. Под лоджиями 1-го этажа запроектированы погреба для жильцов.

Внутренняя отделка квартир:

*Стены* – оклейка обоев, оклейка водостойкими обоями, акриловая (водостойкая) окраска. *Потолки* – акриловая водостойкая покраска, акриловая окраска. *Полы* – плитка керамическая, линолеум. *Двери* – по СТБ 1138, 1647, 1394. *Окна* – из поливинилхлоридных профилей по СТБ 1108, остекление лоджий – по СТБ 1912 из профилей ПВХ с заполнением окон двухкамерным стеклом, остекление – стекло листовое и стекло многослойное безопасное (6–10 этажи).

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы (по направлениям) согласно решению Мингорисполкома от 06.06.2017 №2301.

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры в названном жилом доме на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет – 758,11 рублей.

Начало строительства – 26.04.2017. Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 26.03.2018 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 101, тел.: 399-53-94, 399-53-91.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- направление с места работы
- быть готовым оплатить в течение 3 (трех) рабочих дней с даты получения договора до 40 процентов стоимости объекта долевого строительства.

# ЯК БУДЗЕ ПРЫМЯНЯЦЦА НОВЫ ЗАКОН ПА ДЗІЦЯЧЫХ ДАПАМОГАХ

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў сувязі са зваротамі грамадзян растлумачыла некаторыя асаблівасці прымянення навацый новай рэдакцыі Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».**

Новыя нормы ўступілі ў сілу з 1 ліпеня гэтага года. Гэта не датычыцца вылічэнняў і перыядычнасці пераразліку памераў дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, якія ўступілі ў сілу з 1 жніўня гэтага года.

Што датычыцца памераў дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, то ў ліпені яны засталіся такімі ж, як і ў чэрвені 2017 года.

Незалежна ад даты падачы заявы на той ці іншы від дапамогі (да 1 ліпеня або пасля 1 ліпеня 2017 года) нормы новай і старой рэдакцыі закона прымяняюцца наступным чынам.

**Па адначасовых дапамогах (у сувязі з нараджэннем дзіцяці і жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці):**

нормы новага закона прымяняюцца, калі права на аднаразовую дапамогу паўстала 1 ліпеня 2017 года і пазней; нормы старога закона прымяняюцца, калі права на аднаразовую дапамогу ўзнікла па 30 чэрвеня гэтага года ўключна.

**Па дапамогах па цяжарнасці і родах і дапамогах па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці:**

нормы новай рэдакцыі закона прымяняюцца, калі права на названыя дапамогі (дата пачатку бальнічнага) з'явілася 1 ліпеня 2017 года і пазней. Нормы старой рэдакцыі закона прымяняюцца, калі дзень узнікнення права на гэтыя дапамогі (дата пачатку бальнічнага) — па 30 чэрвеня 2017 года ўключна.

**Па штомесячных дапамогах**

Гэта датычыцца дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў, на дзяцей, старэйшых за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага вірусам імунадэфіцыту чалавека, па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў:

калі штомесячныя дапамогі прадугледжаны за перыяд па 30 чэрвеня 2017 года ўключна, то прымяняюцца нормы старой рэдакцыі закона. Калі штомесячныя дапамогі прадугледжаны за перыяд з 1 ліпеня 2017 года і пазней — прымяняюцца нормы новай рэдакцыі закона.

Усе новаўвядзенні па штомесячных дапамогах, права на якія выдзяляецца новай рэдакцыяй закона (калі такое права адсутнічае ў старой рэдакцыі), уводзяцца ў дзеянне з 1 ліпеня бягучага года.

Грамадзянам прадастаўлены 6-месячны тэрмін для падачы заявы і атрымання дапамог (права на якія ўзнікла па новых нормах) за ўвесь перыяд, пачынаючы з 1 ліпеня 2017 года.

Гэты тэрмін заканчваецца 2 студзеня 2018 года.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

## Добрыя справы

# ДАЕХАЦЬ ДА КЛАСА

### Бярозаўскі цэнтр навучання збірае грошы на школьны аўтобус

**Новы аўтобус для падвозу вучняў Бярозаўскі раённы цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі вырашыў набыць з дапамогай краўдфандынгу (народнага фінансавання).**

Цяпер у цэнтры займаецца 24 дзіцяці-інваліды. Падвоз на ўрокі арганізаваны спецыяльным аўтобусам, абсталяваным пад'ёмнікам для калясак і разлічаным на сем месцаў. На заняткі ў цэнтр дзяцей падвозяць з усяго Бярозаўскага раёна: з вёсак Нарутавічы, Судзілавічы, Стрыгінь, Пескі, гарадоў Белаазёрска і Бярозы. З-за малой умяшчальнасці аўто, ранішні маршрут пачынаецца ў 6.30 і даводзіцца рабіць два рэйсы. У выніку ўрокі ідуць з 8.45, а ранішні падвоз заканчваецца толькі ў 10.20.

Вырашыць праблему можна з дапамогай новага транспарту. У цэнтры ўжо нагледзелі варыянт — аўтобус на 18 месцаў. Ён дазволіць адначасова перавезці практычна ўсіх дзяцей, зменшыць працягласць маршруту і час у дарозе, пачаць заняткі адначасова ва ўсіх класах. Плюс дзеці разам змогуць наведваць раённыя і абласныя мерапрыемствы.

Усяго патрэбна 115 тысяч рублёў. Перaлічыць грошы можна з дапамогай платформы «МаеСэнс». Так, ахвяраваныя 50 рублёў дапамагаюць арганізаваць для дзяцей адзін навучальны дзень.Там жа можна выставіць на аўкцыён сустрэчу з сабой у падтрымку гэтага лота: у сярэднім адна сустрэча прыносіць 30 рублёў на дабрачыннасць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ 6 сентября 2017 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для коллективного садоводства

| Номер лота | Наименование объекта | Место, дата. время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций | Вещное право на земельный участок | Начальная цена предмета аукциона | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 36-03-21 Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 07.08.2017 г. по 01.09.2017 г. с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00 | 321084800019000032<br>площадь 0,1467 га<br>Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №60<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади:<br>0,1467 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож);<br>0,0061 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей);<br>0,0263 га – в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона сетей и сооружений водоснабжения).<br>Имеется возможность подключения электроснабжения. | Частная собственность | 9 704,99 рубля | 884,49 рубля и дополнительно расходы, связанные с опубликованием объявления | 970 рублей на р/с Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549 |
| 2 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 36-03-21 Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 07.08.2017 по 01.09.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16:00 | 321084800019000031<br>площадь 0,1050 га<br>Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок, участок №71<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади:<br>0,1050 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож);<br>Имеется возможность подключения электроснабжения. | Частная собственность | 6 946,32 рубля | 894,40 рубля и дополнительно расходы, связанные с опубликованием объявления | 695 рублей на р/с Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549 |
| 3 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 36-03-21 Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 07.08.2017 по 01.09.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00 | 321084800019000041<br>площадь 0,0989 га<br>Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №34<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади:<br>0,0989 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож);<br>0,0644 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона воздушных линий электропередачи)<br>Имеется возможность подключения электроснабжения. | Частная собственность | 6 461,18 рубля | 861,44 рубля и дополнительно расходы, связанные с опубликованием объявления | 646 рублей на р/с Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549 |
| 4 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 36-03-21 Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 07.08.2017 по 01.09.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00 | 321084800019000042<br>площадь 0,0900 га<br>Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №33<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади:<br>0,0900 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож);<br>0,0437 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона воздушных линий электропередачи)<br>Имеется возможность подключения электроснабжения. | Частная собственность | 5 879,74 рубля | 860,86 рубля и дополнительно расходы, связанные с опубликованием объявления | 588 рублей на р/с Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549 |
| 5 | для строительства и обслуживания магазина продовольственных и промышленных товаров (для размещения объектов розничной торговли) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 36-03-21 Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 07.08.2017 по 01.09.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00 | 321089602110000034<br>площадь 0,1006 га<br>Гомельская обл., Гомельский район, Урицкий с/с, аг. Урицкое, ул. Полевая.<br>Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав на земельный участок.<br>Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения. | Аренда сроком на 49 лет | 4 186,43 рубля | 1 370,86 рубля + расходы, связанные с опубликованием объявления | 419 рублей на р/с Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549 |

Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона: землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок: 8 0232 36-03-21.

**Условия участия в аукционе.**

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии или организации и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за земельный участок или плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить осуществление государственной регистрации земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;

3. в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

4. по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков.

# КЛІМАТ І ЭКАНОМІКА: ЗМАГАЦЦА ЦІ ПРЫСТАСАВАЦЦА?

## Цеплыня і засуха ідуць побач



Па словах Віктара Мельніка, сельскагаспадарчыя арганізацыі паступова пачынаюць выкарыстоўваць станоўчыя вынікі змянення клімату. Так, сёння Беларусь поўнасцю забяспечвае сябе насеннем кукурузы, што пры тэмпературах да пацяплення практычна не было магчыма. Акрамя таго, у гаспадарках Брэсцкай і Гомельскай абласцей укараняецца ў вытворчасць азімы ячмень, высяваецца соя, пашыраюцца пасевы сланечніка, спаржавай фасолі. У Пінскім раёне вядзецца прамысловае вырошчванне вінаграду. Паколькі апошнім часам другая палова лета пераважна сухая і спякотная, сельгаспрадпрыемствы больш выкарыстоўваюць раннія цеплалюбівыя сарты бульбы.

Але трэба не забываць, што разам з павелічэннем цеплазабяспечанасці на тэрыторыі краіны ўсё часцей здараюцца і засухі — адзін з галоўных негатыўных фактараў змянення клімату для сельскай гаспадаркі. Асабліва адчувальныя яны таксама на поўдні Беларусі, дзе знаходзяцца лёгкія пясчаныя землі. Самыя моцныя засухі, па інфармацыі Белгідрамета, адбыліся ў 1992 і 2015 гадах.

**На поўдні краіны з'явілася новая, чацвёртая агракліматычная зона, якая характарызуецца самай кароткай і цёплай у межах Беларусі зімой і найбольш працяглым і цёплым вегетацыйным перыядам. Гэты рэгіён таксама больш стаў пакутаваць ад недахопу вільгаці, перасыхання ворнага слою і іншых праяўленняў засухі.**

— Выкарыстанне кліматычнай інфармацыі, безумоўна, вельмі важнае для сельскай гаспадаркі — яна можа служыць рэзервам павышэння прадукцыйнасці, — адзначае **кліматолаг, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір ЛОГІНАЎ**. — Але без паляпшэння тэхналогій, павышэння культуры земляробства будзе складана дасягнуць значных поспехаў. Даследаванні паказваюць, што на найбольш развітыя ў гэтым плане рэгіёны краіны, напрыклад Гродзенскую вобласць, менш уплываюць кліматычныя фактары.

Здавалася б, цёплыя зімы, якія сталі звычайнымі для Беларусі, павінны станоўча ўплываць на эканомію паліўных рэсурсаў і дзейнасць камунальнай гаспадаркі. Аднак разам з цяплом у краіну прыходзяць і рэзкія перапады тэмператур, якія выклікаюць небяспечныя галалёдныя з'явы. Яны ж негатыўна ўздзейнічаюць і на будынкі, якія былі пабудаваны некалькі дзесяцігоддзяў таму. Прадстаўнікі розных галін эканомікі павінны ўважліва вывучаць усе фактары і быць гатовымі на іх рэагаваць адпаведна: пазітыўныя — актыўна выкарыстоўваць, а ў негатыўных — зніжаць страты.

## Узнаўляльная энергетыка — супраць змянення клімату

Наша краіна з'яўляецца ўдзельнікам Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, а таксама адной з першых, хто далучыўся да Парыжскага пагаднення аб клімаце.

У Плане мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтага пагаднення складзены рэкамендацыі для розных галін эканомікі, якія скіроўваюць на зніжэнне выкідаў парніковых газаў.

— Сёння Беларусь, як і іншыя бакі пагаднення, рыхтуе дакументацыю па выкідах парніковых газаў — дыяксіду вугляроду, метану, аксіду азоту, — расказаў **галоўны навуковы супрацоўнік аддзела міжнародных праектаў БелНДЦ «Экалогія» Іван НАРКЕВІЧ**. — Наш цэнтр збірае інфармацыю па ўсіх прамысловых аб'ектах, уключаючы такія сектары эканомікі, як сельская і лясная гаспадаркі, энергетыка, будаўніцтва, транспарт, утылізацыя адходаў, каб знізіць выкіды парніковых газаў згодна са сваімі абавязацельствамі.

Па словах навукоўцы, у краіне ідзе распрацоўка стратэгіі нізкавугляроднага развіцця. Дакументам прадугледжана большае выкарыстанне ўзнаўляльных крыніц энергіі: ветру, вады, геатэрмальнай энергіі. «Пакуль мы на пачатковым этапе. Але за імі — будучыня», — упэўнены Іван Наркевіч.

## Адаптавацца разам

Сёлета была зацверджана Праграма «Развіццё сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі Саюзнай дзяржавы» на 2017—2021 гады, адным з кірункаў рэалізацыі якой з'яўляецца развіццё сістэмы кліматычнага абслугоўвання насельніцтва і галін эканомікі.

Адаптацыя да змянення клімату можа сыграць ключавую ролю ў зніжэнні пагроз галінам эканомікі абедзвюх краін — Беларусі і Расіі, жыццядзейнасці і здароўю людзей, — гаворыцца ў дакуменце.

Спецыялісты Саюзнай дзяржавы прааналізуюць кліматазалежнасць галін эканомікі з вывучэннем нарматыўна-метадычнай базы, якая рэгулюе дзейнасць у галінах эканомікі з улікам пагодных і кліматычных умоў, прыцягваючы існуючыя даныя аб эканамічных стратах. На іх аснове будуць падрыхтаваны рэкамендацыі па адаптацыі да змянення клімату ў сельскагаспадарчай, будаўнічай, энергетычнай і транспартнай галінах эканомікі сумежных тэрыторый Беларусі і еўрапейскай часткі Расіі. Сярод такіх мер — новыя будаўнічыя нормы і правілы, нормы падачы цяпла і электрычнасці, стварэнне ў будучым сістэм папярэджання і апавяшчэння аб небяспечных з'явах надвор'я і інш.

**З 1 ліпеня 2017 года Белгідрамет перайшоў на новыя кліматычныя нормы. «...Калі раней мы гаварылі, што зіма была на 2—3 градусы цяплейшай за норму, то цяпер з прыняццем таго, што клімат змяніўся, яна цяплейшая толькі на 1 градус. Надвор'езалежныя галіны эканомікі павінны ўлічваць гэты фактар, што таксама будзе пэўным крокам па адаптацыі да змянення клімату».**

Дзякуючы рэалізацыі Праграмы, гідраметэаролагі абедзвюх краін плануюць павялічыць да 2021 года апраўдвальнасць штармавых папярэджанняў пра небяспечныя прыродныя з'явы да 90—92%, а таксама апраўдвальнасць сутачных прагнозаў надвор'я па суб'ектах еўрапейскай часткі Расіі і абласных цэнтрах Беларусі — да 94—96%.

**Вераніка КОЛАСАВА**
*kolasava@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает, что 25 августа 2017 года** состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2. Начало собрания: 14.00. Регистрация акционеров с 13.00. При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О реорганизации ОАО «Минскоблхлебопродукт» путем присоединения к нему КУП «Семена трав» и утверждение передаточного акта.
2. Утверждение размера уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт».
3. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Минскоблхлебопродукт».
4. О дополнительном выпуске акций ОАО «Минскоблхлебопродукт», утверждение решения о выпуске акций.
5. О передаче имущества присоединенного КУП «Семена трав» УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» и утверждение передаточного акта.

УНП 600013173


■ Будзь у курсе!

## Устаноўлены тэрміны збору брусніц і журавін

**Пакуль толькі ў Гродзенскай вобласці. Па інфармацыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, там збіраць нарыхтоўваць і закупляць брусніцы можна з 20 жніўня, а журавіны — з 6 верасня.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях сёлета брусніцы дазволяць збіраць з 16 жніўня, у Магілёўскай — з 22 жніўня, у Мінскай — з 25 жніўня, у Віцебскай — з 26 жніўня. Збіраць журавіны можна будзе ў Брэсцкай вобласці з 1 верасня, у Гомельскай — з 2 верасня, у Мінскай і Магілёўскай — з 8 верасня, у Віцебскай вобласці — з 9 верасня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ВІКТАРЫНА
## Мая Скарыніяна

**Як і абяцалі, змяшчаем сёння пытанні трэцяга, заключнага тура віктарыны, прысвечанай нашаму першадрукару. Як і абяцалі, і ў ім пытанні не з лёгкіх, а некаторыя, можа, і самыя складаныя з усіх, што былі вам прапанаваныя. Тым не менш пры жаданні адказы можна адшукаць на ўсе. Тым самым пашырыць свае веды, якія, як вядома, за плячыма не насіць. А яшчэ пазмагацца за ўзнагароду — бясплатную адмысловую экскурсію па Нацыянальнай бібліятэцы, якую яе спецыялісты зладзяць для тых удзельнікаў, якія дадуць найбольшую колькасць правільных адказаў. Вынікі, нагадваем, будуць падводзіцца па ўсіх трох турах, так што калі крыху памыліліся ў першых двух, не адчайвайцеся, у вас яшчэ ёсць усе шанцы быць сярод пераможцаў.**

***Адказы дасылайце да 15 верасня на паштовы адрас рэдакцыі: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск, з пазнакай «Скарыніяна», або на электронны адрас: skaryna@zviazda.by.***

**Да сувязі! Плёну ўсім і поспехаў!**

### ПЫТАННІ ТРЭЦЯГА ТУРА

**1.** *Адукацыйным цэнтрам якой рэспублікі быў горад Падуя, ва ўніверсітэце якога ў 1512 годзе Францыск Скарына атрымаў ступень доктара лекарскіх навук?*

- Фларэнцыя
- Венецыя
- Сіена
- Генуя

**2.** *Біблія Скарыны — пяты па ліку надрукаваны пераклад Святога Пісання. На якіх чатырох жывых мовах Біблія была выдадзена да скарынаўскай?*

- Нямецкай, італьянскай, чэшскай, галандскай
- Англійскай, нямецкай, італьянскай, чэшскай
- Французскай, галандскай, нямецкай, італьянскай
- Іспанскай, чэшскай, нямецкай, галандскай

**3.** *Якімі знакамі Скарына нумараваў старонкі сваіх выданняў?*

- Арабскімі лічбамі
- Літарамі кірылічнага алфавіта
- Літарамі лацінскага алфавіта
- Рымскімі лічбамі

**4.** *У якой з кніг Скарыны змешчана гэта гравюра?*



- У Чацвёртай Кнізе Царстваў
- У Кнізе Руфі
- У Кнізе Другога закона
- У Першай Кнізе Царстваў

**5.** *Адзіную з кніг Біблії Скарына выдай двойчы. Якую?*

- Псалтыр
- Апостал
- Малую падарожную кніжку
- Эклезіяст

**6.** *У фільме «Я, Францыск Скарына» галоўную ролю — самога першадрукара — іграе Алег Янкоўскі. А каго ў тым жа фільме іграе яго старэйшы брат Расціслаў?*

- Карчмара
- Івана Скарыны
- Рэйхенберга
- Манаха-езуіта

**7.** *Хто аўтар кнігі пра Скарыну, якая пачынаецца з прысвячэння: «Усім маці кругу светлага паднябеснага, імёны якіх сёння людзям невядомыя, ды імёнамі сыноў якіх землі розных куткоў кругу паднябеснага славіцца не перастануць...»*

- Уладзімір Караткевіч
- Алесь Разанаў
- Алег Лойка
- Адам Глобус

**8.** *Чыё імя да нядаўняга часу насіў праспект Францыска Скарыны ў Полацку?*

- Уладзіміра Леніна
- Якава Свярдова
- Пятра Машэрава
- Карла Маркса

**9.** *Дзе ў Беларусі пастаянна экспануюцца арыгіналы Скарынавых выданняў?*

- У Нацыянальным гістарычным музеі
- У Нацыянальнай бібліятэцы
- У Полацку, у Музеі беларускага кнігадрукавання
- У Нацыянальным мастацкім музеі

**10.** *Пытанне ад Нацыянальнай бібліятэкі. Хто быў другім пасля Францыска Скарыны друкаром у Вялікім Княстве Літоўскім?*

■ Трыбуна для літаратара

# Выкажыся ў газеце, каб цябе пачулі

**Па тэме «Літаратура на старонках «Звязды», па вялікім рахунку, можна абараніць не адну кандыдацкую дысертацыю. За стагоддзе існавання газеты, універсальнай па сваім змесце (тут ёсць і практычныя парады з розных сфер, і тэксты мастацкія, толькі для душы), шмат што змянілася ў літаратурным і культурным жыцці краіны. Разам з павагай да пісьмовага слова ў грамадстве ўзрастала і цікавасць да асобы пісьменніка, а эканамічныя, сацыяльныя катаклізмы змушалі творцаў хутчэй адгукацца на падзеі рэчаіснасці, звяртацца да чытача не са старонак раманаў ці аповесцяў, а пісаць эсэ, вершы, часта публіцыстычныя па сваім пафасе.**

НЯРЭДКА наша газета для пісьменнікаў служыла спосабам данесці свае думкі да шырокага чытача, выказаць меркаванне адносна вострага, балючага для грамадства пытання. Памятаеце хрэстаматыйную гісторыю 1913 года і дыскусію, што вялі на старонках «Нашай нівы» Вацлаў Ластоўскі і Янка Купала? Дык вось і пазней газеты станавіліся пляцоўкамі для гарачых спрэчак, месцам ідэйнага сутыкнення літаратараў, навукоўцаў. Напрыклад, згадаем гісторыю 1979 года. На старонках «Звязды» вядомы пісьменнік, акадэмік Кандрат Крапіва апублікаваў праграмны артыкул «Ці будзем мы ездзіць па левым баку?». У ім досыць рэзка выказваўся супраць занадта моцнай прыхільнасці некаторых творцаў да «беларускасці» беларускай мовы, з-за якой яны «адхіляліся ад агульнапрынятых правіл і норм». Тэкст выклікаў шырокі розгалас у творчых колах, яго доўга абмяркоўвалі, пісалі Крапіве адкрытыя лісты. Аднак ніводзін з іх — нават нашага былога супрацоўніка і асабістага памочніка Якуба Коласа Максіма Лужаніна — не быў апублікаваны: не рэкамендавалі ідэалагічныя супрацоўнікі.

Свае публіцыстычныя артыкулы, у якіх аўтар разважаў пра небяспеку атамнай вайны і тыя пагрозы, што яна нясе чалавецтву, друкаваў у «Звяздзе» Алесь Адамовіч, а па пытаннях мовы часта выказваліся вядомыя навукоўцы, у іх ліку — слынны прафесар Фёдар Янкоўскі.

МНОГІЯ нашы класікі пачыналі свой шлях на старонках «Звязды», многія заставаліся ёй аддадзенымі чытачамі ўсё жыццё. У ліку апошніх варта згадаць равесніка нашага выдання — паэта Пімена Панчанку. У інтэрв'ю да свайго 75-годдзя (а значыць, і ў год 75-га звяздоўскага юбілею) ён падкрэсліваў: «Адразу пасля піянерскіх газет я чытаў бацькаву «Звязду». А з 1934 года, як пачаў настаўнічаць, стаў выпісваць газету — і выпісваю да сённяшняга дня. Толькі вайна перапыняла сяброўства са «Звяздой»... Папулярнасць газеты была вялікай і да вайны. Напрыклад, успамінаю, як у 1939 годзе, у час паходу ў Заходнюю Беларусь, мы выпускалі франтавую газету «Беларуская звязда». Некаторыя здзіўляліся: чаму «звязда», па-беларуску ж будзе «зорка»? Тлумачылі, што назва франтавой газеце дадзена пад уплывам рэспубліканскай «Звязды», у якой ужо на той час было шмат добрых традыцый...»

Дарэчы, тады ж Пімен Панчанка адмыслова для «Звязды» напісаў верш і пакінуў свой аўтограф для чытачоў.

**ГОРКІЯ ДУМКІ**

Была зямля, цяпер — малыя соткі...
Адданасць знікла
да карміцелькі-зямлі,
Няма ўжо бульбы той —
разварыстай і сопкай,
І не гудуць скрозь пчолы і чмялі.

З наседжаных мясцін
сагналі нас Хрушчовы,
І мы — неперспектыўныя —
пайшлі да гарадоў.
Сяліліся ў смярдзючыя трушчобы,
А на кватэры спіс — на сто гадоў.

Глядзім і лічым, што яшчэ не ўкралі?
Пра што зноў хлусяць?
Веры больш няма...
Даўно мы з лёну палатно не ткалі...
У сэрцы непагодная зіма.

А мы яшчэ жывыя,
Мы — не зломкі.
І дзе ты, мудрая эканамістаў раць?
І хто прымусіў нас ля ніў
сваёй старонкі
І праклінаць, і моўчкі паміраць?

Чырвоныя паны,
Старшыняў клас вясёлы,
Закрылі фермерам
і дбалым людзям шлях.
Няма кармоў і ражуць добрых цёлак,
Хаваюць жыта па глухіх кутках.

Дакуль цярпець крадзеж і рабаванне,
Развал і дыктатуру нечуваных цэн?
Ці прыйдзе зноўку залатое ранне?
Ці выжывуць падаткі з родных сцен?

Пра гэта ўсё мы думаем так горка
І спадзяёмся: хто? калі? калі?
Запаліць нам жыцця і праўды зорку,
І працы радасць пойдзе па зямлі?

МОЖНА сказаць, што «Звязда» працягвала традыцыі літаратурна-публіцыстычнага супрацоўніцтва, закладзеныя англічанінам Чарльзам Дыкенсам яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Гаворка ідзе пра рашэнне папулярнага аўтара, каб прыцягнуць увагу да сваіх раманаў, публікаваць іх часткамі на старонках газеты. Хітры ход выдатна працаваў і ў XX стагоддзі, а адкрыццём смела карысталіся і беларускія аўтары, і звяздоўцы. Так, у ліку класікаў, хто выказаў жаданне прадставіць свой новы твор найперш у «Звяздзе», а ўжо потым — асобнай кнігай, згадаем Івана Мележа. Паводле ўспамінаў аднаго з рэдактараў газеты Аркадзя Тоўсціка, Мележ тэлефанаваў яму асабіста і выказваў пажаданне друкаваць у газеце ўрыўкі з рамана «Завеі, снежань» (трэцяй часткі яго знакамітай «Палескай хронікі»). «З вялікай павагай да аўтара, — піша спадар Тоўсцік, — мы друкавалі гэты твор з нумара ў нумар».

НАША газета стала сапраўдным трамплінам у вялікую літаратуру для многіх класікаў паэзіі і прозы. У іх біяграфіях нярэдкія згадкі, што пасля заканчэння ўніверсітэта некаторы час працавалі ў «Звяздзе», а ўжо потым — набраўшыся моцы, вопыту, паспытаўшы свае сілы ў цяжкой працы штодзённай газеты, пераходзілі на работу ў штотыднёвік «Літаратура і мастацтва», часопіс «Беларусь», выдавецтвы, на тэлебачанне. У ліку вядомых пісьменнікаў-звяздоўцаў можна назваць больш як тры дзясяткі імёнаў. Некаторыя з іх — сапраўды знакавыя для нашай літаратуры. Гэта паэтка, перакладчыца Еўдакія Лось, празаік Віктар Карамазаў, паэты Валянцін Таўлай, Ніл Гілевіч, Анатоль Вялюгін, Сяргей Законнікаў, Сцяпан Гаўрусёў. А вось Мікола Ракітны (сапр. прозвішча Новікаў) пачаў супрацоўніцтва з нашай газетай і ў якасці літаратурнага работніка, і як мастак.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Фестываль

# Сем невідавочных спектакляў з праграмы «ТЭАРТу», на якія варта набыць білеты

**Штогадовы міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ», на гэты раз сёмы, аб'явіў сваю праграму. Сёлета ён пройдзе з 27 верасня да 16 кастрычніка і на розных пляцоўках сталіцы пакажа восем замежных пастановак і адзінаццаць у праграме «Belarus open». Адпаведна, ужо можна набыць білеты: у першую чаргу ўвагу прыцягнулі імёны кшталту Цімафея Кулябіна, які пакажа на форуме спектакль «Іванаў», альбо Яўгена Міронава, які ў гэтай пастаноўцы сыграе. Мы ж звярнуліся да адборшчыка і дырэктара форуму Анжалікі Крашэўскай, каб яна параіла нам некалькі спектакляў, якія не прывабяць гледача гучнымі імёнамі, але па розных прычынах іх варта было б убачыць.**

## «Іліяда» Ернея Ларэнцы (Славенія)

— Заўсёды кажу, што хардрока нам яшчэ не хапала. Візуальна вельмі нечаканы спектакль, пасля прагляду глядач абавязкова стане фанатам альбо Гамера, альбо пастаноўкі, альбо Ернея Ларэнцы. Сёння шмат рэжысёраў звяртаецца да эпасаў і міфалогіі, якія, здавалася б, адышлі ў мінулае. Гамер найбольш вядомы са старажытнагрэчаскіх аўтараў і славенец асучасніе яго (гледачу незразумела, у якім часе адбываецца дзеянне), бярэ складаны матэрыял «Іліяды» і прапускае яго праз сябе разам з акцёрамі, якія становяцца аднадумцамі. Тут можна будзе пачуць паэтычны пераклад «Іліяды» на славенскі, але Гамерам спектакль не абмяжоўваецца: рэжысёр выкарыстоўвае яго, каб пагаварыць пра тое, што хвалюе яго самога. Тут будзе шмат смелых рэчаў, але не хочацца раскрываць сакрэты. У 2014 годзе мы ўжо прывозілі на «ТЭАРТ» пастаноўку Ларэнцы, гэта быў «Крэйзі лакаматыў». «Іліяда» такая ж драйвовая, тут таксама вялікую ролю адыгрывае музыка, і гэта той выпадак, калі рэжысёр не баіцца эксперыментаваць і яго апантанасць апраўданая.

## «Цень думкі нашай» Ніны Абуховай (Беларусь)

— Ідзе пад рубрыкай «забытыя аўтары», альбо «забытыя спектаклі». Віцебскага тэатра даўно не было ў Мінску, а тут ён узяўся за твор Францішка Аляхновіча, вакол якога, як персоны, шмат пытанняў. Яго і забаранялі, і абвінавачвалі ў даносах. «Цень думкі нашай» стане чарговым напамінам пра нашу гісторыю, не лішнім для тых, каму важна, што адбываецца ў Беларусі і беларускім тэатры. Цікава ўжо толькі паглядзець, як твор «Цень думкі нашай» увасобілі на сцэне, бо гэта няпросты матэрыял. Калі мы глядзім «Чайку», мы хоць бы ведаем сюжэт, прасцей жа глядзець тое, што ведаеш і разумееш. Я думаю, Аляхновіча не ўсе чыталі, таму гэта будзе дарэчны акцэнт на беларусах, такі зварот да сябе, які прастымулюе да ўсяго гэтага цікавасць. На спектакль варта ісці, каб правесці «даследаванне» і зразумець, пра што пісаў аўтар.

## «Сёстры Макалуза» Эмы Дантэ (Італія)

— Гісторыя, што адбываецца ў «Сёстрах Макалуза», нам вельмі блізкая, нягледзячы на ментальную адрознасць італьянцаў. Вялікая сям'я перажывае гібель родных людзей, а на сцэне — размовы і развагі герояў на пахаванні. Якраз тая форма, што дапамагае нам рэфлексаваць. Складана зразумець, дзеянне адбылося ўчора ці трыццаць гадоў таму, што сімвалічна, маўляў, некаторыя рэчы нязменныя. Невядома таксама, хто тут жывы, а хто ўжо не. Напэўна, такіх драматычных спектакляў, як «Сёстры Макалуза», пасля якіх ты глядзіш на жыццё па-іншаму і нешта пераасэнсоўваеш, нам і не хапае. Трэба паспрабаваць вынесці з пастаноўкі як мага больш, адчуць гэтае разуменне, хоць і на некаторы час, што часам цяжар адказнасці застаецца на плячах назаўсёды і ад яго немагчыма пазбавіцца.



«Сёстры Макалуза».

## «Дзеці Ванюшына» Сяргея Найдзёнава (Беларусь)

— Наша задача як фестывалю — паказаць найбольш яркія беларускія работы, мы ж запрашаем замежных гасцей, а беларускаму тэатру з замежным канкурыраваць складана, бо еўрапейскі і рускі зайшлі далёка ўперад. Мы спрабавалі за імі падглядзець на шкоду свайму ўласнаму. Развіццё ж павінна быць і ў нас, таму важна, што у Маладзёжным тэатры, дзе з поспехам адна за адной паказваюцца камедыі, у той час як драматычны тэатр не карыстаецца попытам у беларускага гледача, з'явіліся «Дзеці Ванюшына». Складаны твор складана і «рухаць», а «Дзеці Ванюшына» — няпростая рэч, трэба быць гатовым мучыцца разам з акцёрамі. Пастаноўка ўключана ў рэпертуар і магчымасць яе ўбачыць яшчэ будзе, але няхай праграма «ТЭАРТу» паслужыць пэўнай рэкамендацыяй.

## «Дэман» Уладзіміра Панкова (Кыргызстан, Расія)

— На фестываль «ТЭАРТ» упершыню трапіла пастаноўка з Кыргызстана. «Дэман» спалучае лермантаўскую паэзію і эпас кыргызскага народа на кыргызскай мове. Спектакль Уладзіміра Панкова — гэта саўнд-драма, заснаваная на гуках і музыцы, як «Іліяда». Тут ты разумееш, што тэатр з Кыргызстана становіцца цікавым, таму што ідзе за сваімі традыцыямі і яму ёсць што сказаць, і думаеш, як акцёры могуць іграць з вершаванай формай так, што ты адчуваеш трагізм гэтага немагчымага па рэлігійных матывах кахання. Ты аказваешся ў свеце, дзе можна зрабіць нешта з-за кахання, але не насуперак традыцыям. «Дэман» стане экскурсіяй у вядомы твор Лермантава, перакладзены на патрэбы рэжысёра. Панкоў стварае і эфектную карцінку, дзеянне адбываецца ў гарах — як гэта ўвасобіць на сцэне? Мы, дарэчы, павінны забяспечыць для дэкарацый друз з пенашклом. Той выпадак, калі можна будзе эмацыянальна падключыцца да пастаноўкі нават праз пахі.

## «Пакорлівая» рэжысёра Алены Медзяковай і харэографа Ганны Корзік (Беларусь)

— Як Дастаеўскага можна паказаць у танцы? Такая спроба — смелы крок, бо трэба здолець увасобіць сваю ідэю і растлумачыць, чаму «Пакорлівая» ставіцца не ў драматычным тэатры, а неяк інакш. Мова пастаноўкі знаходзіцца паміж пластыкай і харэаграфіяй з невялікай колькасцю тэксту. Пра тэатр танца «Альтана» я даведалася толькі нядаўна, ён з ліку незалежных груп, якія займаюцца незалежным тэатрам і ўласнымі праектамі.

## «У шуфлядцы», калектыўная творчасць (Германія)

— Мы паказвалі розныя нямецкія пастаноўкі, і гэты спектакль будзе для нас нечым новым, хоць жанр дакументальнага тэатра даволі распаўсюджаны. «У шуфлядцы» заснавана на абсалютна рэальных гісторыях: героі, жыхаркі Берліна, расказваюць гісторыі пра сябе і свае сем'і, перабіраюць рэчы сваіх бацькоў, успамінаюць падзеі з жыцця. Мы гэтую тэму — нямецкае мінулае — ведаем толькі па дакументальных фільмах, а тут — эмоцыі і гісторыі рэальных людзей. Кожнаму ёсць што сказаць: тут будуць гучаць нават інтымныя рэчы, звычайна вядомыя толькі аднаму чалавеку альбо вузкаму колу людзей, расказаныя цікавай і зразумелай мовай. Спектакль стварыла жаночая творчая група: ад акцёраў да рэжысёраў.

**Запісала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Калі пагадзіцца з тым, што па лірычных творах (а «Радаўніцкія свечкі» — апавяданне, якое мае ў сабе яўныя прыкметы такога твора) можна меркаваць пра характар іх аўтара і нават пра род яго заняткаў — апроч уласна літаратурнай творчасці, то Таццяна Цвірка ўяўляецца чалавекам светлым, шчырым, інтэлігентным, які тонка адчувае харасто і любіць дзяцей. Хто па прафесіі? Думаю, многія (зноў-такі, прачытаўшы сённяшняе конкурснае апавяданне) захочуць уявіць яе настаўніцай. Ці супрацоўніцай дзіцячага садка. І будуць мець рацыю: Таццяна Канстанцінаўна працавала і загадчыкам дзіцячага сада-ясляў, і настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе, і ў Клецкім дзіцячым доме. Апошнія дзесяць гадоў паспяхова займаецца прыватным бізнесам. А хто сказаў, што бізнес падпарадкоўваецца толькі людзям жорсткім і па сваёй натуры далёкім ад лірыкі?..**

**Алесь БАДАК.**

# РАДАЎНІЦКІЯ СВЕЧКІ

Таццяна ЦВІРКА

АЎТОБУС крута павярнуў метраў за трыццаць ад магазіна і спыніўся. Задаволена прасіпеў, расчыняючы дзверы, выпусціў апошніх пасажыраў на канцавым прыпынку. Нягуста іх было: мужчына інтэлігентнага выгляду ў чорным плашчы з капелюшом на галаве, што саскочыў з прыступкі і адразу пашыбаваў у магазін, ды маладая жанчына з дачушкай-школьніцай. Яны выйшлі, агледзеліся, накіраваліся паўз агароды, па полі, у бок мясцовых могілак.

Аніта, паўнагрудая сімпатычная жанчына гадоў трыццаці, у цёмнавішнёвай балоневай куртцы, джынсах і скураных красоўках, несла ў руцэ чорную торбу. Торба, відаць, была няцяжкай, бо ішла Аніта хутка, не зважаючы на палявую гразкаватую яшчэ сцежку, краем вока назіраючы, ці паспявае за ёй дачушка Людка.

Паспявала! Сямігадовае дзяўчо дробна перабірала ножкамі ў зялёненькіх гумавых боціках, пэўна, баючыся хоць на крок адстаць ад матулі. За спінай у Людкі ў такт яе хадзе падскокваў аліўкавы, з жоўценькімі замочкамі, заплечнік — падарунак Дзеда Мароза.

ГАМАНІЛА вясна. Тут, у полі, яе гоман быў асабліва гучны, але неразборлівы. Ён то разліваўся звонкай паднябеснай песняй жаўранка, то рэзаў слых непрыемным карканнем варон, то даносіўся ледзь улоўным шумам палявога раўчука, што бег уздоўж агародаў.

Вясна пахла свежай падталай раллёй, прэлай перазімаванай саломай, гаркаватым дымком ад спаленай старой травы.

Хоць не вельмі ахвотна раздораваў цёплыя дні сярэдні сын вясны — красавік, яна прыхарошвалася. Нацягвала бялюткія панчохі на старыя яблыні, разліла салатавую фарбу на маладую траўку, сыпнула з дзясятак добрых жменяў жоўтых пацерак падбелу на прыгоркі.

Аніта спынілася. Крыху перавяла дух ад шпаркай хады, скінула куртку — сонейка добра прыпякала ў спіну. Услед папрасілася і Людка: «І я скіну, мне горача!» — на носіку блішчалі малюсенькія кропелькі поту.

— Пацярпі, дачушка, амаль прыйшлі. А то ўвагрэлася, вецер падзьме — зноў кашляць пачнеш.

ВЯСКОВЫЯ могілкі сустрэлі панура. На невысокім плоце, што іх агароджваў, можна было разгледзець плямы даўнішняй блакітнай фарбы. Праслы плота пахіліліся, сям-там упалі на зямлю. Леташні няскошаны асот ды сівыя дубцы лебяды амаль у чалавечы рост адчувалі сябе гаспадарамі каля старых штыкецін.

Каля ўвахода Аніта падняла закіданую смеццем адараную брамку, прыставіла да плота. Неяк трывожна пераклікнуліся думкі, зашчымела ўспамінамі сэрца. Гэтыя могілкі ў яе памяці з дзяцінства. Штогод яны з матуляй прыязджалі сюды перад Вялікаднем. Тут спачывае маміна мама, Аніціна бабуля Зіна. Рана пайшла яна з жыцця. І не раз расказвала Аніце мама пра трагічны лёс бабы Зіны.

У далёкія пяцідзясятыя прыехала яна з мужам у невялікую вёску, куды паслалі яго працаваць аграномам. І хатку далі ім сваю, і дачушку праз год яны нарадзілі, і лёс абяцаў сыпаць шчасце прыгаршчамі... Ды прыглядзела, мабыць, прыгажуню Зінку лупавокая смерць, прыдумала ей раптоўны канец: маладая жонка, маці двухгадовай малечы, поўная надзей на бурлівае і шчаслівае жыццё, так недарэчна падавілася хлебнай крошкай, якая заскочыла ў дыхальны праход... І праз колькі хвілін Зінка сканала. Пахавалі Зінку на старых могілках, а праз нейкі час яе муж з немаўляці, Аніцінай мамай, ажаніўся з іншай жанчынай і з'ехаў у другі раён. Так вось і засталася яе магілка ў гэтай далёкай вёсцы, сярод старых аднавяскоўцаў, дзе сёння, напэўна, калі кладзецца спаць сонейка, цьмяна свецяцца вокны не больш дзясятка хатак-пенсіянерак.

АСЦЯРОЖНА, праз помнікі і агароджы ішла да знаёмай магілкі, ведучы за руку дачку. Дзіўна — маўчала гаваркая Людка, напэўна, стамілася ад хады. Падышлі бліжэй. Спалохана затрапяталася Аніціна сэрца, падкасіліся ногі: над самым помнікам звесілася тоўстае галінастае дрэва. Надламаны з паўметра ад зямлі ствол ледзь трымаўся за падтрухлелы пень. Здавалася, некалькі дотыкаў — і дрэва ляжа на невысокі граніт, разаб'е яго і самне прыгожы крыжык.

— Божа, божа, як дрэва зламалася! Стой, Людачка, не ідзі бліжэй, а то яшчэ на цябе зваліцца, — самой жа захацелася расплакацца: ні сякеры, ні пілы, хто б мог падумаць пра такое? Вядома ж, дрэва ёй не пад сілу... Агледзелася вакол. Як кінуць вокам — амаль усе магілкі прыбраны, пасыпаны пясочкам, стракацяць вяночкі, штучныя кветкі. У тутэйшых мясцінах традыцыя — прыбірацца на могілках да Вялікадня. На Радаўніцу сюды прыходзяць лічаныя людзі. Непадалёку Аніта заўважыла яшчэ некалькі пахіленых дрэў. Воддаль — такі ж малюнак. «Пэўна, бура іх так скалечыла», — падумала ўслых.

Вуха ўлавіла шум крокаў, нос адчуў пах цыгарэтнага дыму. Азірнулася. Адразу і не пазнала дзеда Васіля. Стары зусім стаў, нягалены, з-пад кепкі выбіваліся сівыя валасы.

— А-а-а, унучачка, сяброўку маю прыехала праведаць? Ну то здарова была!

— Добрага дня, дзед Васіль, рада бачыць вас здаровага ды вясёлага!

— Старэю, дзіця, хутка і я дамоў пайду, месца вось каля свае Кацярыны апратаў. А то твая чарнавочка? — кіўнуў на дзяўчынку.

— Ага, Людка мая.

— Добры дзень, — нясмела прывіталася малая.

— Дзед Васіль, вось стаю ды гарую. Глянула — дрэвы па ўсіх могілках да зямлі прыхіліліся, падаюць здаецца вось-вось. І гэтае во, да бабулінага помніка зараз прытуліцца.

— Э, Аніта, гэта ж летась, як улетку бура была, пакасіла іх. Вось і ліпяць. Пакутуюць, зажыва паміраюць. Ліпа старая ўпала, Сямёніхі помнік пабіла, то Іван прыехаў, зрэзаў бензапілою на дровы. А гэтыя во чакаюць пары, грымнуцца і яны.

— Дзед Васіль, то амаль год ужо часу прайшло з таго лета, няўжо няма каму дрэвы пазрэзваць?

Стары дакурыў папяросу, затушыў яе, прысеў на невялікі камень каля плота.

— От, унучка, адным махам дрэва не ўпарадкуеш. У нас у вёсцы Алесь самы малады, а яму за шэсцьдзясят. Дзеці-ўнукі прыедуць, адно што падграбуць, а астатняе — не маё гарыць, не мне тушыць. Унь у суседняй вёсцы сабралі людзі грошай трохі з кожнай хаты, нанялі нейкую брыгаду з райцэнтра, то тыя прыехалі, паспілоўвалі, паскладалі, дый ляжаць каля плота на могілках, бо на вываз грошай не хапіла. Там таксама амаль усе пенсіянеры жывуць. А ў нас... Адны «грыбы» старыя, па сваіх падворках ледзь соваюцца.

— То ёсць жа ўлада, старшыня калгаса, сельсавета, дэпутаты.

— Ой, любачка, гэта пакуль выбрацца, яны мех і торбу наабяцаюць, потым мы і галасы іх забыліся, добра, як праскочыць каторы калі па сяле ды галавою кіўне. А да цэнтра хто пацягнецца? Хто туды свае жальбы панясе?

Дзед працяжна цмокнуў, нібы набіраў паветра, каб прадоўжыць гаворку.

— Ты, Аніта, праўды не шукай. Сярод варон жыўшы — варонай і каркай. Ты ж таксама на пару гадзінак, пакуль аўтобус назад ісці будзе... Давай вось лепш памагу звярнуць дрэва ўбок, каб помнік не дзёўбнула. Пайду, унь, Андрэя клікну, ён тут у Мані агароджу фарбуе, бо хварэў, ужо думаў не ўстане, але бач, прышкандыбаў пацюху, адпусціла, мабыць, хвароба.

АНІТА пачала выграбаць лісце грабелькамі без чаранка, маленькім драпачыкам пасвяжыла зямлю. Побач мітусілася Людка. Чытала надпісы на суседніх помніках:

— «Семянчук Людміла Пятроўна. Ж. 68 г. Памяць мужа». Ой, мамачка, тут пахавана нейкая цёця Людміла, у нас імёны аднолькавыя.

— Людміла! Прыгожае імя. Гэта значыць людзям мілая, спагадлівая.

— А мая бабуля Зіна таксама была спагадлівай? — пачала сыпаць пытанні дзяўчынка.

— Зіна — гэта мая бабуля, а твая — прабабуля. Бабуля твая Ірына, што ў Іванаве жыве.

— А мая прабабулька Зіна якая была? Добрая і спагадлівая? — не супынялася Людка.

— Добрая, вельмі добрая, мо і памерла маладая таму, што бажанька самых лепшых забірае. А ты ідзі во там пахадзі, дзе дрэў няма. На фотаздымкі паглядзі, пачытай, тут нашы продкі ляжаць.

Утраіх ледзьве ссунулі дрэва ўбок. Яно нягучна, па-старэчы крэкнула, быццам робячы апошні ўздых, лягло на зямлю, прыкрыўшы галінамі некалькі помнікаў, але ствалом не чапіла.

— Якраз во лягло між магіл, тут яму і вечны спачын. Як ніхто не даўмеецца на дровы парэзаць, то, можа, я зяця ўгавару, як прыедзе на майскія.

— Дзякуй вам, дарагія памочнікі, а то я ўжо ці не плакаць сабралася.

— А ты паплач. Паплач сабе, унучка, — зноў палез у кішэню па цыгарэту дзед Васіль. — Па ўсіх нас гаротных паплач, па гэтым кладзьбішчы занядбаным, па долі нашай старэчай, адзінокай. Бо смерць не пытае і не перапрашае — усіх яна зраўняе. Усіх зямелька прыме і накрые. Толькі вось шкада, што дзяцей сваіх мы не навучылі, што самае святое быльнягом ды лебядой зарастае, што во, плота новага няма каму паставіць. А ў дваццаць першым стагоддзі жывём!.. — зацягнуўся цыгаркай дзед, закашляўся, бы дымам падавіўся, а гэта крыўда запяршыла ў горле, заціснула... — Хадзем, Андрэй, пацыху!

АНІТА прысела на зламанае дрэва, шкрабала маленькім венічкам аб зямлю. Яе душылі слёзы. Ад роспачы, што яна нічым не можа дапамагчы гэтым нямоглым старым, а яны, дзяды, выручылі яе. Ад сораму, што забыты мясцовай уладай сцежкі да зарослых магіл сваіх продкаў, ад горычы, што людзі, якія ўсё сваё жыццё аддалі зямлі, працы ў родным калгасе, не заслужылі гонару ляжаць у дагледжаным месцы, прыбраных магілах, каля пафарбаванага плота ды прыгожага вялікага крыжа ў бялютких ручніках і агністых кветках... Праўда, не навучыліся мы і дагэтуль рабіць бескарыслівыя справы, прымаць чужы боль, як свой, не акультурыліся, водзім у сябрах сквапнасць, зайздрасць ды сябелюбства...

Думкі перабіла Людка:

— Мама, мама, а я там магілку знайшла, яна ўся зарасла, адно драўляны крыжык стаіць на маленькім грудку. Можа, падмяцём яе?

На бабулін крыж Аніта павесіла яркі вяночак, разам з дачкой запалілі свечку. Жанчына ўкленчыла, пачала шаптаць малітву. Стала побач на каленкі і малая, перажагналася, мыляла губкамі разам з мамай «Ойча наш».

— Мамачка, а кветку туды пакладзём? На той гурбячок, ну хоць адненькую-ю-у? — працягла спытала Людка.

АНІТА асцярожна адарвала ад вялікага штучнага букета галінку з чатырма кветачкамі, укінула ў сумку грабелькі, венічак, драпач. Людка ўзяла матулю за руку, павяла, амаль пацягнула яе да знойдзенай магілкі. Сама старанна грабелькамі зграбла перапрэлую лістоту. Ручкамі абарвала траву. Аніта намацала пад лісцем невялікі кавалак пліты. Акуратна з Людкай пачысцілі яе, нават заўважнымі сталі выбітыя літаркі і лічбы. Прозвішча не разгледзелі, прачыталі імя Мікалай, добра была відна і лічба 8.

— Восем гадкоў пражыў Мікалайка, — уздыхнула жанчына. — Напэўна, яго мама і тата даўно ўжо не жывуць...

— Значыць, тут пахаваны маленькі хлопчык, амаль як я... — Людка неяк сцялася ўся, прыціхла на хвілінку. Затым рухавенька пачала скідаць са спіны свой шыкоўны заплечнічак, пакорпалася крыху ў ім і дастала невялікую свечку. — Во, мамулька, я ж узяла з дому. Давай запалім.

Аніта чыркнула запалкай. Полымя лізнула тонкую нітку свечкі, ціхенька затрашчала. Паставіла свечку на ачышчаны грудок.

— Глядзі, глядзі, мамачка, буслік! — раптам закрычала Людка, падняўшы голаў, пільна праводзячы поглядам вялізную чорна-белую птушку, якая, старанна махаючы крыламі, паляцела ў вёску.

— Буслік! — як дзіця, зарадавалася і Аніта. — Добра першы раз вясной убачыць бусліка на ляту. Шчаслівым год абяцае для нас быць!

ДА аўтобуснага прыпынку пайшлі не спяшаючы. Аніта, перасыпаючы, нібы ў пясочным гадзінніку, невясёлыя думкі, спынілася на рашэнні — найперш наведаць калгасную кантору і сельсавет.

Людка — радуючыся, што яны прыбралі хлопчыку яго хатку (хай яму хораша спіцца), ловячы сябе на здагадцы: а можа, гэты бусел і не просты бусел зусім, а можа, гэта той Мікалайка праляцеў? І сама сабе міла ўсміхнулася.

А ззаду, на старэнькіх вясковых могілках, з удзячнасцю і надзеяй пазіралі сваімі гарачымі палымянымі вочкамі радаўніцкія свечкі.

# ...АД ПОЛАЦКА ПАЧАЎСЯ СВЕТ



**Полацк не ўпершыню прымае Дзень беларускага пісьменства. І адпаведна не ўпершыню серыя «Беларусь літаратурная» выдавецтва «Мастацкая літаратура» прадстаўляе зборнік мастацкіх і мастацка-публіцыстычных твораў пра Полацк і Полаччыну. Раней была выдадзена кніга з назвай «Там, дзе вежы Сафіі». Зараз — «Сафійка. Полацк. Родны край». Укладальнікам абедзвюх кніг з'яўляецца вядомы беларускі паэт і публіцыст Навум Гальпяровіч.**

«Не скажуць у Полацку: — Сафійскі сабор./ Тут яго называюць ласкава: / — Сафійка.../Так партызаны / сваіх сувязных называлі...» — чытаем у вершы народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, якому і Полацк, і ўся Віцебшчына не чужыя. Шчымлівая памяць пра розныя гістарычныя часіны гучыць у творах Уладзіміра Караткевіча, Сяргея Панізніка, Генадзя Бураўкіна, Валянціны Лукшы, Міколы Мятліцкага, Людмілы Рублеўскай, Янкі Сіпакова, Віктара Шніпа і іншых паэтаў і празаікаў.

Асобным раздзелам прадстаўляе ўкладальнік полацкае літаратурнае аб'яднанне «Надзвінне». Дарэчы, гэтая супольнасць талентаў бярэ свае вытокі з літаратурнай філіі «Маладняка» ў Полацку. Імёны Алеся Дудара, Сымона Хурсіка, Тараса Хадкевіча, Алеся Звонака — сярод пачынальнікаў, першапраходцаў у арганізацыі літаратурнага працэсу ў Полацку, на Полаччыне. А сёння іх справу доўжаць, пашыраючы Галіна Загурская, Ала Іванова, Наталля Краско, Ала Шваёко, Валянціна Сопікава (яна, у прыватнасці, выступае з грунтоўным літаратурна-краязнаўчым артыкулам «Янка Купала ў Полацку») і шмат хто яшчэ.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ВЯРТАННЕ ЛЕМУРЫІ



## Ці здолее Мадагаскар выкарыстаць свае перавагі?

**Мадагаскар нячаста з'яўляецца ў навінавых стужках сусветных інфармагенцтваў. Апошнім часам гэтая астраўная дзяржава часцяком згадваецца ў сувязі з дэфіцытам ванілі на сусветным рынку, які выклікаў небывалы рост цэн. Мадагаскар — бясспрэчны сусветны лідар вытворчасці стратэгічнай прадукцыі (забяспечвае каля 80 працэнтаў паставак). Як вядома, ваніль — самая дарагая спецыя ў свеце пасля шафрану. Яе рынак ацэньваецца ў $1,3 мільярда. І гэта, відаць, не апошняя коштавая мяжа. Цана на ваніль значна ўзрасла за апошнія некалькі гадоў і складае больш за $200 за фунт (у параўнанні з $11 у 2011-м). Тым не менш эканамічная сітуацыя Мадагаскара, мякка кажучы, даволі складаная, у рэгіёнах нярэдка ўзнікае голад. Ці здолее астраўная дзяржава ўсё ж выкарыстаць свае перавагі і пераадолець нестабільнасць?**

### Чароўны аскепак

Мадагаскар — чацвёрты па велічыні востраў нашай планеты пасля Грэнландыі, Новай Гвінеі і Барнеа. Велічынёй з Іспанію і Партугалію ці Францыю і Бельгію разам узятыя. Яго плошча складае 590 тысяч квадратных кіламетраў. У даўжыню Мадагаскар працягнуўся на 1600 кіламетраў, яго шырыня — больш за 600 км. Знаходзіцца ў Індыйскім акіяне, аддзелены ад Афрыкі 400 кіламетрамі Мазамбікскага заліва.

На велізарным востраве людзі жывуць на працягу дзвюх тысяч гадоў. Жыхары Мадагаскара называюць сябе малагасійцамі і з'яўляюцца нашчадкамі афрыканцаў і азіятаў. Большасць прышэльцаў прыбылі з Малайзіі і Палінезіі, а таксама з Інданезіі і Паўднёва-Усходняй Азіі. Афрыканцы-рабы, арабы, індыйцы і партугальскія гандляры, піраты з Еўропы, французскія асаднікі — усе перамяшаліся з мясцовым насельніцтвам і ўтварылі афіцыйна існуючыя сёння 18 «плямёнаў» ці кланаў, якія насяляюць востраў.



У адрозненне ад «вулканічных» суседзяў, Маўрыкія і Рэюньёна, Мадагаскар — востраў невулканічнага паходжання, які адкалоўся ад «чорнага кантынента» каля 165 мільёнаў гадоў таму у выніку яго дрэйфу. Доўгі час (да 40 млн гадоў таму) існаваў перашэек паміж востравам і Афрыкай, які праходзіў па сучасных Каморскіх астравах. Востраў знаходзіцца ў актыўнай тэктанічнай зоне, пацвярджэнне чаму патухлыя вулканы, тэрмальныя крыніцы і землятрусы. Нягледзячы на блізкасць да Афрыкі, большасць раслін і жывёл Мадагаскара аказаліся эндэмікамі (насяляюць толькі гэтыя мясціны), а колькасць іх настолькі вялікая, што востраў цалкам можна лічыць часткай загінулага старажытнага кантынента (часта яго цяпер і называюць не інакш як кантынентам). Таксама навукоўцы адзначылі, што карэнныя жыхары не адносяцца да экватарыяльнай расы, яны значна бліжэйшыя да жыхароў Інданезіі. Прыйшоўшы да такіх высноў, навукоўцы і высунулі версію аб існаванні кантынента або ланцуга астравоў у Індыйскім акіяне, якія калісьці распасціраліся ад Афрыкі да Суматры і Індыі. Назву гэтага загінулага кантынента прапанаваў у 1858 годзе брытанскі заолаг Філіп Латлі Склейтэр. Яна звязана з дзіўнымі істотамі, якіх ён сустрэў на Мадагаскары. Гэтымі жывёламі аказаліся лемуры. Яны вядуць начны лад жыцьця, вочы ў лемураў свецяцца, а галасы нагадваюць выццё ці плач, у вонкавым абліччы змяшаны рысы чалавека, коткі і медзведзяняці. Таму Склейтэр назваў патанулы кантынент Лемурыя, каб падкрэсліць яго ўнікальнасць. На Мадагаскары вераць, што ў чалавека і лемура былі агульныя продкі. Той, хто захацеў працаваць, стаў вырошчваць рыс. А гультаяватыя мясцовыя жыхары сталі лемурамі і пасяліліся на дрэвах. Менавіта з гэтай прычыны забойства звярка на Мадагаскары — страшны грэх.

У 1500 годзе партугальцы адкрылі для Еўропы гэты дзіўны востраў. Пазней сюды прыбылі англічане і французы. Еўрапейскія місіянеры перавялі многіх тутэйшых у хрысціянства. У XIV—XV стагоддзях у цэнтры Мадагаскара склалася дзяржава Імерына, вакол якой да пачатку XIX ст. сфарміравалася адзінае Малагасійскае каралеўства. У 1895 годзе да ўлады прыйшлі французы, і востраў фактычна стаў калоніяй гэтай дзяржавы. У 1960-м краіна дамаглася незалежнасці. Але яшчэ 10 гадоў на чале дзяржавы стаяў прафранцузскі ўрад. У 1975-м прэзідэнтам стаў Дыдзье Рацыракa, які праводзіў сацыялістычную антызаходнюю палітыку. У 1991 годзе з-за масавых акцый пратэсту ён прыняў больш дэмакратычную канстытуцыю. На выбарах у 1993-м прэзідэнтам абраны ліберал Альбер Зафі. Але яго рэфарматарская дзейнасць аказалася не занадта паспяховай і скончылася імпічментам. З 1997-га прэзідэнтам Мадагаскара зноў стаў Дыдзье Рацыракa. У 2009 годзе ў выніку перавароту да ўлады прыйшоў Андры Радзуэліна, былы мэр Антананарыву. З 2014-га на чале астраўной дзяржавы стаў Эры Мартыяль Радзаўнарымампіяніна (дарэчы, у яго самае доўгае прозвішча сярод кіраўнікоў дзяржаў ва ўсім свеце).

### Вага «цяжкай» нафты

У сённяшнім Мадагаскары нізкі ўзровень жыцця. Многія мясцовыя жыхары выжываюць менш чым за два долары ў дзень. Паводле інфармацыі ААН, амаль палова дзяцей хранічна недаядаюць. На поўдні краіны родныя забіраюць навучэнцаў са школ, каб яны шукалі, дзе зарабіць, здабывалі прадукты харчавання, драўніну і ваду. Як заўважае шэраг экспертаў, у большай ступені галеча гэтага прыгожага вострава выклікана шматгадовай палітычнай нестабільнасцю. У сярэдзіне 1970-х Мадагаскар робіць спробы пабудовы камуністычнага рэжыму, што менш чым за два дзесяцігоддзі аказала негатыўны ўплыў на мясцовую эканоміку. Палітычны крызіс 2002-га, звязаны з супрацьстаяннем прыхільнікаў Дыдзье Рацыракі і новым прэзідэнтам Маркам Раваламана, моцна ўдарыў па эканоміцы краіны, знізіўшы ВУП за год на 12,7%. Перыяд 2002—2005 гадоў абазначыўся як час барацьбы з інфляцыяй і паступовага нарошчвання ВУП, не ў апошнюю чаргу дзякуючы ўліванням замежных дзяржаў і фінансавых інстытутаў.

Аснова мясцовай эканомікі —



экстэнсіўная сельская гаспадарка. Тут не хапае сучасных тэхналогій, а пры патрэбе павелічэння ўраджаю пашыраюцца апрацаваныя землі. Большасць насельніцтва занята сялянскай працай — вырошчваюць рыс (50% рацыёну насельніцтва), кукурузу, сізаль, а таксама экспартныя культуры — гваздзік, ваніль, каву. Жыхары вострава таксама нарыхтоўваюць лес, ловяць рыбу, разводзяць жывёлу (галоўным чынам зебу — падвід дзікага быка — адно з першых месцаў у свеце па пагалоўі).

Асноўнымі крыніцамі росту эканомікі з'яўляюцца экспарт прадукцыі тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці, прадуктаў сельскай гаспадаркі і карысных выкапняў. Дзякуючы ўнікальнай фаўне вострава, біятурызм прыцягвае ўсё большую колькасць людзей з розных куткоў планеты. Зоны свабоднага гандлю, размешчаныя каля Антананарыву і Анцырабэ, маюць сваёй мэтай гандаль з ЗША і Еўропай.

На тэрыторыі Мадагаскара ёсць радовішчы лушчака (2-е месца ў свеце па запасах), графіту (4-е месца) і храмітаў. Таксама на экспарт здабываюцца каменны вугаль, ільменіт і нікель. На поўдні рэспублікі выяўленыя два буйныя нафтавыя радовішчы. На адным з іх — Цімірора — асваенне ўжо ідзе поўным ходам. Яго патэнцыял велізарны — да 2 мільярдаў бараляў «чорнага золата». Гаворка ідзе пра так званую цяжкую нафту, гатункі з высокай шчыльнасцю. Выканаўчы дырэктар кампаніі Madagascar oil Джон Клаўсэн перакананы: «Гэта нафта выдатна падыходзіць для вырашэння энергапраблем Мадагаскара. Вельмі хутка яна часткова пойдзе на вытворчасць электраэнергіі. Мы спадзяёмся, што з часам нашу нафту будуць выкарыстоўваць і ў іншых галінах прамысловасці». У распрацоўку радовішча ўкладзена 300 мільёнаў долараў прыватных інвестыцый. 90% работнікаў — мясцовыя жыхары. Інвестары, якія прыйшлі ў рэгіён, не абмяжоўваюцца бізнесам, яны ўжо пабудавалі тут школы, бальніцы, распрацавалі інавацыйную праграму па захаванні натуральнага прыроднага асяроддзя. Джон Клаўсэн заўважае: «Мы будзем вывозіць нафту з радовішча па аўтатрасе. Гэта добрая магчымасць заняцца мясцовымі дарогамі. Вытворчасць нафты падштурхоўвае нас да вырашэння сумежных задач. Па меры развіцця праекта такіх задач будзе больш». Не выключана, што мясцовай нафтай зацікавяцца і новыя гульцы з-за мяжы. У прыватнасці, у паветры носіцца ідэя будаўніцтва трубаправода і порта на ўсходнім узбярэжжы.

Шматлікія даследаванні паказалі: на Мадагаскары 5 седыментацыйных басейнаў з велізарным вуглевадародным патэнцыялам. На поўдні вострава нядаўна выявілі радовішча прыроднага газу, а таксама новыя залежы нафты. Галоўны менеджар Нацыянальнага ведамства па кантролі за горназдабыўной галіной Банавентуры Расаанаіва расказвае: «Мы ацанілі геалагічны патэнцыял запасаў нафты на ўзроўні паўтара трыльёна бараляў. Мадагаскар прапануе замежным партнёрам каля 40 шэльфавых пляцовак для распрацоўкі і 3—4 блокі на тэрыторыі вострава». Каб паскорыць прыток інвестараў, улады краіны абяцаюць аптымізаваць падатковыя ўмовы для замежнікаў, якія арэндуюць радовішча на доўгі тэрмін».

### Мост паміж Афрыкай і Азіяй

Мадагаскар займае выгадную геапалітычную пазіцыю і гатовы стаць мостам для актывізацыі эканамічнага ўзаемадзеяння паміж краінамі Афрыкі і Азіі. Пра гэта заявіў прэзідэнт краіны Эры Мартыяль Радзаўнарымампіяніна. «Мадагаскар — частка афрыканскага кантынента, наша краіна знаходзіцца на скрыжаванні, займаючы важную геапалітычную пазіцыю паміж Азіяй і Афрыкай. Мы спадзяёмся стаць мостам для актывізацыі эканамічнага супрацоўніцтва двух кантынентаў. Мадагаскар зацікаўлены ў рэалізацыі сумесных праектаў «Пояса і шляху» (эканамічны пояс Шаўковага шляху і марскі шаўковы шлях XXI стагоддзя)», — абвясціў кіраўнік дзяржавы падчас Азіяцкага эканамічнага форуму ў кітайскім Боаа. Ён выказаў надзею, што азіяцкія краіны, у прыватнасці КНР, пры рэалізацыі сумесных праектаў у належнай меры будуць улічваць інтарэсы астраўных дзяржаў, у тым ліку Мадагаскара. Радзаўнарымампіяніна падкрэсліў, што канцэпцыя «Пояса і шляху» выгадная для краін Афрыкі, якія разлічваюць на прыток азіяцкіх інвестыцый. «Мы павінны аб'яднаць намаганні, умацаваць партнёрскія адносіны, сумесна адказаць на выклікі, якія нясе ў сабе пратэкцыянізм», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Радзаўнарымампіяніна адзначыў, што Мадагаскар найбольш зацікаўлены ў азіяцкіх прамысловых тэхналогіях, фінансавых рэсурсах, развіцці сумесных праектаў у галіне малога і сярэдняга бізнесу. «Дзякуючы ўзаемадзеянню ў гэтых напрамках мы зможам павысіць эфектыўнасць нацыянальнай палітыкі, павялічыць дабаўленую вартасць тавараў, якія выпрацоўваюцца Мадагаскарам у глабальным ланцужку паставак, павысіць узровень народнага дабрабыту», — рэзюмаваў ён.

Шэраг прагрбыхмных выказванняў Радзаўнарымампіяніна прагучаў у інтэрв'ю Euronews. «Я перш за ўсё хачу, каб у краіне ўсталявалася стабільнасць. Нам патрэбна палітычная стабільнасць. Гэта неабходна, каб прыцягваць інвестараў. Стабільнасць выяўляецца ва ўсталяванні прававаой дзяржавы, у актывізацыі барацьбы з карупцыяй і злоўжываннямі ўладай. Мы валодаем вялікім патэнцыялам у розных сферах, напрыклад у турызме. Перш за ўсё трэба ўзяць пад увагу нашу экасістэму, якая з'яўляецца адной з самых унікальных на планеце, у нас ёсць эндэмічная фауна і флора, якую можна знайсці толькі на Мадагаскары. Усё гэта дазваляе прапаноўваць іншы вопыт турызму, заснаваны на экалагічным развіцці».

«Цяпер нават дзеці чулі пра Мадагаскар. Людзі праяўляюць цікавасць да нашай краіны, я адчуваю, што пакрысе і свет камерцыі пачынае цікавіцца. Вядома, не толькі з-за фільма (папулярны дзіцячы мультфільм студыі Pixar, дзе, дарэчы, даволі вольна адлюстроўваецца жывёльны свет вострава — насамрэч тут няма львоў, жырафаў, бегемотаў, пінгвінаў і зебраў — **Аўт.**), але ён даў іншым магчымасць даведацца аб Мадагаскары». Ці выкарыстае належным чынам усе свае перавагі астраўная дзяржава, пакажа час. Прынамсі, выглядаюць яны вельмі перспектыўна.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*



алімпіец
ЗВЯЗДА
Выпуск №8 (57)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



■ Анонс

## Футбол памяці

**У Мінску пройдзе міжнародны юнацкі турнір па футболе памяці Юрыя Курненіна.**

Ён стартуе сёння і працягнецца да 16 жніўня. Удзел у сёмых па ліку спаборніцтвах прымаюць футбалісты не старэйшыя за 2002 год нараджэння. У сталіцу Беларусі прыехалі прадстаўнікі акадэмій казанскага «Рубіна», маскоўскіх «Дынама», «Тарпеда» і «Чартанава». Таксама ў турніры прымаюць удзел выхаванцы акадэміі футбольнага клуба «Мінск» і сталічнага «Дынама».

Юрый Курненін — чэмпіён Савецкага Саюза па футболе (1982), бронзавы прызёр (1983). Фіналіст Кубка СССР (1987), былы трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі. Памёр Юрый Анатолевіч у 2009 годзе

■ Чулі?

## Жанчыны сярод арбітраў

**У Маладзечне прайшоў судзейскі збор, удзел у якім упершыню прынялі дзве дзяўчыны, якія ўжо раней працавалі на спаборніцтвах пад эгідай Федэрацыі хакея Беларусі. У сезоне-2017/18 Віталія Хаміцэвіч і Анастасія Танасевіч паспрабуюць сябе ў якасці лінейных суддзяў, абслугоўваючы матчы найвышэйшай лігі чэмпіяната Беларусі.**

У федэрацыі хакея краіны адзначылі, што раней ФХБ ужо выступала з рэкамендацыяй да абслугоўвання жаночых спаборніцтваў пад эгідай Міжнароднай федэрацыі хакея. Цалкам магчыма, што хтосьці з дзяўчат ужо ў найбліжэйшым сезоне атрымае першыя міжнародныя прызначэнні.

Заўважым, што заняткамі на зборы галоўных і лінейных арбітраў, а таксама інспектараў судзейскага корпуса кіраваў старшыня судзейскага камітэта ФХБ Уладзімір Праскураў. Удзел у мерапрыемстве прынялі 63 чалавекі

■ Хакей

## ПАЧНЁМ З ЧЭМПІЁНАЎ

**Міжнародная федэрацыя хакея апублікавала каляндар матчаў чэмпіянату свету 2018 года ў элітным дывізіёне. Нагадаем, планетарнае першынство пройдзе ў дацкіх гарадах Капенгаген і Хернінг з 4 па 20 мая. Зборная Беларусі згуляе ў групе А, дзе сустрэнецца са зборнымі Расіі, Швецыі, Чэхіі, Швейцарыі, Славакіі, Францыі і Аўстрыі. Матчы групы А прыме ў Капенгагене Royal Arena ўмяшчальнасцю 12,5 тыс. чалавек.**

Удзельнікамі турніру ў групе В стануць зборныя Канады, Германіі, ЗША, Фінляндыі, Нарвегіі, Латвіі, Рэспублікі Карэя і гаспадыня турніру — Данія. Гульні гэтай групы пройдуць на Jyske Bank Boxen у Хернінгу, якая ўмяшчае 11 тыс. гледачоў.

Свой першы матч на турніры зборная Беларусі правядзе супраць дзеючых чэмпіёнаў свету — каманды Швецыі, а завершыць групавы этап паядынкам супраць Славакіі.

***Расклад матчаў:***

04.05 — Швецыя — Беларусь (пачатак — 21.15),
05.05 — Францыя — Беларусь (17.15),
07.05 — Беларусь — Расія (17.15),
09.05 — Швейцарыя — Беларусь (17.15),
11.05 — Беларусь — Чэхія (21.15),
12.05 — Аўстрыя — Беларусь (17.15),
15.05 — Беларусь — Славакія (17.15).

Чвэрцьфінальныя паядынкі пройдуць на абедзвюх арэнах, а паўфіналы, запланаваныя на 19 мая, і фінал 20 мая прыме Royal Arena. Білеты на сусветны хакейны форум — 2018 паступяць у продаж 1 верасня

■ Новыя імёны

# «ЛІЧУ, ШТО СПАРТСМЕН ПАВІНЕН БЫЦЬ ГАЛОДНЫМ»

## Чэмпіён Еўропы прыадкрывае сакрэты паспяховых скачкоў

**Максім НЕДАСЕКАЎ выйграў кантынентальны чэмпіянат па лёгкай атлетыцы (U-20) у скачках у вышыню з вынікам 2 метры 33 сантыметры, на надаўніх Алімпійскіх гульнях у Бразіліі такая вышыня прынесла спартсмену з Украіны Багдану Бандарэнку бронзавы медаль. Акрамя таго, Максім перапісаў рэкорд юнацкага чэмпіянату Еўропы, які заставаўся непахісным на працягу 40 гадоў. Нягледзячы на тое, што так паспяхова малады спартсмен яшчэ не скакаў, у планах пакарыць яшчэ больш крутыя вышыні і дагнаць цяперашняга лідара ў гэтым відзе спорту катарца Мутаза Эса Баршыма, які паказвае вынік 2.37. У сваім інтэрв'ю Максім расказаў пра атмасферу чэмпіянату Еўропы, пра тое, што матывуе яго на вынік, і як звычайна праводзіць дзень старту.**




— На гэты турнір у італьянскі Грасета я ехаў толькі за «золатам». На чэмпіянаце Беларусі паказаў добры вынік — 2.26, нягледзячы на тое, што стан быў не вельмі добры, таму смела разлічваў на медаль. У кваліфікацыі выкарыстаў не шмат сіл, хутка аднавіўся, але самаадчуванне ў фінале мне ўсё роўна не падабалася — не адчуваў сваіх ног. Калі выйшаў у сектар, пачаліся скачкі, усё стала на свае месцы. Па выніках сапернікаў у кваліфікацыі думаў, што выйграю спаборніцтвы з вышынёй 2.26, але хлопцы з іншых краін узялі 2.28, мне прыйшлося нанесці сваю спробу на 2.30. Сабраўся, настроіўся, успомніў, што на мяне глядзіць столькі людзей на трыбунах, хварэюць дома, і ўсё атрымалася.

***— Выніку ў 2.30 хапала для перамогі, але ты вырашыў паспрабаваць яшчэ вышэй — 2.33...***

— Так, гэтая спроба нічога не вырашала, 2.32 я ўжо спрабаваў скакаць, а на сантыметр вышэй — не, вырашыў зрабіць гэта. У трэцяй спробе ўсё атрымалася ідэальна, хацеў яшчэ пастарацца ўзяць 2.35, але не атрымалася, да таго ж здарылася траўма. Скончыў спаборніцтвы з вынікам 2.33, усталяваўшы асабісты рэкорд і рэкорд спаборніцтваў. Быў у вялікім шоку.

***— Што важней — выйграць медаль або ўсталяваць рэкорд?***

— Я хацеў проста выйграць і забраць залатую ўзнагароду, а тут яшчэ і вынік такі, блізкі да алімпійскага п'едэстала Рыа.

***— Акрамя свайго выніку, здзівіла што-небудзь у Італіі?***

— Больш за ўсё рассяленне — мы жылі ў манастыры, пабач знаходзіліся манашкі. Гэта было неяк дзіўна. Адбой у 23 гадзіны, выйсці пасля гэтага часу немагчыма, у нумарах не было разетак для ноўтбука, гэта стварала некаторую няручнасць, але потым мы прывыклі.

### «Гуляю ў Dota, каб не думаць аб спаборніцтвах».

***— Якую вышыню плануеш скарыць далей?***

— Для пачатку трэба прывыкнуць да гэтай, рухацца далей пакуль не хачу, ды гэта і не атрымаецца. Хачу пастарацца заўсёды скакаць 2.28, каб часам атрымлівалася 2.30, гэтага пакуль досыць.

***— Немалы шум на чэмпіянаце Еўропы выклікала сітуацыя з Віялетай Скварцовай, на ўзнагароджванні якой перблытал гімны.***

— Гэта памылка арганізатараў, я не думаю, што ўчынак быў зроблены наўмысна. Так, яны вінаватыя, але казаць, што гэта проста катастрофа, не варта, такое здараецца. А што датычыцца Віялеты, думаю, на яе месцы, так паступіў бы любы спартсмен, у тым ліку і я.

***— Вернемся да твайго віду спорту. У скачках важна думаць, сачыць за паводзінамі сапернікаў і тактычна пралічваць, якую вышыню варта заявіць у пэўны момант?***

— Вядома, гэта абавязковы кампанент поспеху, які да таго ж аказвае псіхалагічны ціск на спартсмена. Я яго адчуваў ужо не моцна, таму што да гэтага ўдзельнічаў у шматлікіх камерцыйных турнірах і прывык да такой атмасферы. Часта спартсмен сам вырашае, якую вышыню заявіць, часам раіцца з трэнерам, мы з маім настаўнікам ужо разумеем адзін аднаго з погляду, таму тут нават не трэба слоў.

***— Шмат што ў скачках залежыць ад навакольнага асяроддзя?***

— Так, асабліва для мяне. Чым больш людзей на стадыёне, тым мацнейшая падтрымка, тым прасцей мне скакаць. Увага мяне не скоўвае, а, наадварот, надае ўпэўненасці. Шмат што залежыць ад пакрыцця стадыёна — цвёрдае яно або мяккае. Ёсць залежнасць і ад надвор'я. Непажадана, каб быў вецер — у залежнасці ад таго, з якога боку ён дзьме, трэба карэктаваць разбег. Самая камфортная тэмпература дзесьці +25 градусаў. У дождж мы, дарэчы, таксама скачам.

***— Як звычайна спраўляешся з хваляваннем?***

— На ўсе турніры спецыяльна бяру з сабой ноўтбук, гуляю ў Dota, каб не думаць аб спаборніцтвах. Але гуляю або сяджу ў інтэрнэце, толькі калі ёсць вольны час, таму ноўтбук не адчыняю наогул, хоць раней не мог жыць без яго.

***— Як праходзіць для цябе дзень спаборніцтваў?***

— У гэты дзень я практычна не ем. Лічу, што спартсмен павінен быць галодным, тады ён лепш выступае. Гэта, вядома, не датычыцца тых відаў спорту, дзе атлету трэба шмат энергіі. Прачнуўся, п'ю гарбату з шакаладкай і іду на размінку, калі ёсць час да старту, то слухаю музыку ці гляджу цікавыя відэа. Пасля спаборніцтваў ужо адрываюся, ем усё, што хачу, больш за ўсё люблю мяса.

***— Што з'яўляецца для цябе галоўнай матывацыяй?***

— Я хачу зарабляць грошы, каб поўнасцю забяспечваць сябе, мець кватэру, машыну. Калі казаць пра спартыўныя мэты, то, вядома, як любы спартсмен, імкнуся да алімпійскага медаля, а там ужо як атрымаецца.

***— На твой погляд, якія агульныя рысы аб'ядноўваюць чэмпіёнаў?***

— Талент, працаздольнасць і правільная псіхалогія. Думаю, што галоўным інгрэдыентам у рэцэпце поспеху ўсё ж з'яўляюцца задаткі з дзяцінства — гэта 60 працэнтаў.

***— Звычайна пераход з маладзёжнага ў дарослы спорт адбываецца цяжка і не заўсёды паспяхова, не баішся гэтага?***

— Тут больш псіхалогіі, не трэба задумвацца пра тое, што не ўсё так проста, лепш больш працаваць, прыслухоўвацца да свайго арганізма, і тады ўсё атрымаецца. Я ўжо прымаў удзел у дарослых камерцыйных турнірах, спаборнічаў з алімпійскімі чэмпіёнамі і абгульваў іх. Зараз найлепшы ў свеце ў скачках — спартсмен з Катара, яго вынік у гэтым сезоне 2.37, гэта досыць высока, але спадзяюся, што ў мяне знойдуцца сілы дарасці да яго.

***— Што самае складанае ў спорце для цябе на сённяшні момант?***

— Пакуль усё ідзе добра, не адчуваю асаблівых праблем. Складана даводзіцца ў асноўным зімой, калі ў спартсменаў закладваецца база, там напружанне не толькі фізічнае, але і псіхалагічнае — доўгая манатонная праца. У нейкі момант трэба проста сябе пераламаць, перацярпець.

***— Наогул, з відам спорту ты вызначыўся адразу?***

— Не, два гады займаўся плаваннем, потым боксам, мне вельмі падабалася, але бацькі пастаянна настойвалі, каб я пайшоў у лёгкую атлетыку. Яны самі спартсмены, майстры спорту — бацька ў бегу з бар'ерамі, мама ў скачках у даўжыню. Я ў дзяцінстве наогул усё выйграваў, потым спыніўся на трох дысцыплінах — бар'еры, скачкі ў даўжыню і вышыню. І цяпер, дарэчы, вельмі добра бягу спрынт, праўда, у красоўках, шыповак у мяне няма. Вельмі хацелася б паспрабаваць у іх, але трэнер не дазваляе.

***— Вынікі ў скачках у вышыню прыйшлі адразу?***

— Усё ішло паступова і залежала ад працы. Я ведаў, што ў гэтым сезоне зрабіў вельмі вялікі і якасны аб'ём работы, таму вынік павінен быў прыйсці.

***— Калі б не спорт...***

— Нават не ведаю, чым бы я мог займацца, у дзяцінстве вельмі любіў стралялкі, хацеў трапіць на вайну



■ На старце сезона

# КАМАНДА ДРУГОГА ШАНЦУ,

## або Знаёмімся з навічкамі вышэйшай лігі чэмпіянату краіны па гандболе

**«Віцязь» за сваю нядоўгую пяцігадовую гісторыю паспеў пабываць студэнцкай камандай, базай для юнацкай і маладзёжнай зборных краіны, але, здаецца, заўсёды заставаўся тым калектывам, дзе збіраюцца не аматары, а ўлюбёныя сэрцам у гандбол. Чаму яны гатовыя гуляць без добрых спартыўных заробкаў, што ў прыярытэтах у самага беларускага гандбольнага клуба краіны і якія задачы ставіць перад сабой «Віцязь» у сезоне 2017/18, мы даведаліся, пабываўшы на адной з трэніровак каманды.**

* * *

Гэты праект узнік у 2012 годзе на чыстым энтузіязме. І калі, напрыклад, для Германіі гэта было б не дзіўна, таму што большасць спартыўных клубаў там будуецца менавіта па такім прынцыпе, то для Беларусі «Віцязь» стаў навінкай.

— Цікава і адметна, што гэта каманда не ініцыяваная дзяржавай, а створаная грамадствам. Першапачаткова яна сфарміравалася на базе БДЭУ і была студэнцкай, — расказвае **Аляксандр АПЕЙКІН**, які стаяў каля вытокаў стварэння клуба, а цяпер з'яўляецца яго дырэктарам. — А потым у адзін момант у «Віцязю» сабраліся прафесійна падрыхтаваныя гульцы, якія па розных прычынах завязалі з гандболам. Хтосьці атрымаў траўму, хтосьці не бачыў перспектыў далейшага развіцця і вырашыў атрымліваць адукацыю, камусьці проста не знайшлося месца ў беларускіх клубах, таму што іх у нас не так шмат.

Студэнцкая каманда хутка выйграла шматлікія турніры аматарскага ўзроўню, таму і ў кіраўніцтва і ў гульцоў сама сабой узнікла думка, што «Віцязь» можа перарасці ў штосьці большае. Аднак, не маючы практыкі, у чэмпіянаце Беларусі, куды заявілася каманда, яна сутыкнулася з вялікай колькасцю выклікаў, пачынаючы ад адміністрацыйных пытанняў, заканчваючы праблемамі са сваёй нестабільнай гульнёй.

— Потым два гады мы працавалі з Рэспубліканскім вучылішчам алімпійскага рэзерву. На базе клуба гуляла каманда 1996 года нараджэння, у «Віцязю» паспрабавалі сабраць самую таленавітую моладзь краіны. Даць ацэнку гэтаму эксперыментальнаму варыянту цяпер складана, — кажа Аляксандр Апейкін.

У той час, як дарослая частка каманды працягнула выступаць на аматарскіх турнірах, таленавітая моладзь разбеглася, бо ў клуба не было магчымасці плаціць гульцам зарплату. З таго складу «Віцязя» выраслі выдатныя прафесіяналы, якія сёння прадстаўляюць зборную краіны і выступаюць у прэстыжных клубных топ-турнірах — Аляксандр Падшывалаў, Андрэй Юрынок, Арцём Кулак.

— Для нас гэта класны сімвалічны капітал, бо першым клубам у кар'еры хлопцаў назаўжды застанецца «Віцязь».

* * *

Нягледзячы на тое, што ў клубе сёння гуляюць людзі зусім розных прафесій — работнік МАЗа, дырэктар, бізнесмен, бармен, загадчык кафедры і іншыя, — хлопцы справядліва не любяць, калі іх называюць аматарамі.

— У нашым разуменні аматары — гэта тыя, хто не да канца разбіраецца ва ўсіх дэталях гандбола, але ім падабаецца гэтая гульня, — гаворыць дырэктар клуба. — У нас жа ўсе гульцы прафесійна падрыхтаваныя, многія з іх гулялі за маладзёжную зборную (Арцём Красуцкі, Іван Юркевіч, Канстанцін Грыбаў, Аляксандр Ланін, Антон Ладуцька і іншыя), іх «ляпілі» з самага дзяцінства. Напрыклад, Вячаслаў Жолудзеў гуляў у складзе зборнай Беларусі, якая стала 6-й на маладзёжным чэмпіянаце свету ў Бразіліі, але так склалася, што ў нейкі момант застаўся без клуба. Гэта чалавек, які ў «Віцязю» можа перазапусціць сваю кар'еру.

Дарэчы, перазапуск кар'еры ў гэтай камандзе — ужо добрая традыцыя, летась у эстонскі клуб перайшоў Мікіта Ермашэвіч, сёлета за мяжой аказаліся запатрабаваныя «віцязі» Антон Бароўскі і Сяргей Радзюкоў. Пры тым што, напрыклад, Сяргей ужо тры гады сумяшчаў гульню ў гандбол з работай менеджара па лагістыцы.

— У нас шмат хлопцаў з цікавымі гісторыямі жыцця. Напрыклад, Арцём Красуцкі — найталенавіцейшы хлопец — у нейкі момант з-за праблем са здароўем (складаныя траўмы двух каленяў), аказаўся за мяжой гандбола, а ў «Віцязю» зноў знайшоў сябе, летась закінуў больш за 180 мячоў за сезон. Варатар Вадзім Котаў — унікальная асоба, пагуляў, напэўна, ва ўсіх клубах Беларусі, самы вялікі абаронца варот у краіне. Гуляе ў нас і брат вядомага Максіма Бабічава (зараз гулец украінскага «Матора» і зборнай Беларусі) — Дзмітрый, найразумнейшы хлопец, дырэктар лагістычнай кампаніі.

* * *

Кіраўнікі і стваральнікі адзначаюць, што асноўная матывацыя ўсіх гульцоў «Віцязя» — даказаць, што яны нічым не горшыя за гульцоў, якія лічаць сябе прафесійнымі гандбалістамі ў нашай краіне.

— Практычна ўсе хлопцы не дагулялі сваё, рана скончылі кар'еру, а ўзровень іх гульні яшчэ дазваляе канкурыраваць з іншымі клубамі на зусім «не аматарскім» узроўні, таму «Віцязь» — гэта клуб другога шанцу.

Паколькі ў каманды пэўны час не было спонсараў і яна ніяк не фінансавалася дзяржавай, у калектыве была створана сістэма ўзносаў, гульцы самі пакрывалі значную колькасць выдаткаў.

— Пазней неабходнасць гэтай сістэмы адпала, сёння ў нас ёсць партнёры, якія дапамагаюць з транспартам, аплачваюць форму. І, ведаеце, унікальная для краіны сітуацыя — яны нават не хочуць атрымліваць за гэта рэкламу. Наогул, вядома, вялікі плюс гандбола ў тым, што ён вельмі бюджэтны від спорту. Летась каманда добра гуляла, гэта прыцягнула пэўную ўвагу і выклікала сур'ёзны давер з боку федэрацыі і многіх людзей у гандболе.

* * *

На пачатку 2016 года да каманды далучыўся вядомы ў Беларусі трэнер — Аляксандр Жыркевіч. Кіраўніцтва адзначае, што з гэтага моманту ў «Віцязя» пачаўся новы этап. Каманда стала разрастацца, хоць да гэтага былі цяжкія моманты, калі на трэніроўкі прыходзіла літаральна 6—7 чалавек.




— Цяпер мы выканалі ўсе патрабаванні, каб гуляць у вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі. Ёсць абавязковая ліцэнзія ў трэнера, доктара, падрыхтавалі форму, якая павінна адпавядаць пэўнаму ўзору. Дамашнія матчы будзем праводзіць у Мінску, на пляцоўцы РЦАР па вуліцы Філімонава. Добра, што сёлета паднялі часавую планку правядзення гульняў па будных днях. Да гэтага рэгіянальныя клубы любілі паставіць гульню дзе-небудзь на 16 гадзін, забываючы, што галоўная асоба ў спорце — гэта глядач.

Дарэчы, з імі ў «Віцязя» пакуль цяжка, хоць каманда спадзявае, што да сярэдзіны сезона людзей на трыбунах стане прыкметна больш.

— Наш праект будуецца не на матэрыяльных каштоўнасцях, гэта шмат у каго выклікае сімпатыю. Мы думаем, што наша асноўная аўдыторыя якраз не гандбольная, а людзі, для якіх гандбол — гэта штосьці новае. На наш погляд, патэнцыйнага балельшчыка павінна зацікавіць, што клуб не дзяржаўны, з цікавымі жыццёвымі гісторыямі гульцоў і трэнераў, і думаю, «Віцязь» — самы беларускі гандбольны клуб у краіне. Мы перайшлі на беларускую мову цалкам, таму, можа быць, наша задача прыцягнуць балельшчыка ўскладнілася, але гэта свядомы крок. Мы хочам рабіць штосьці карыснае для краіны, штосьці шчырае і цікавае, а мова — гэта адна з самых галоўных каштоўнасцяў. Акрамя таго, сёлета ў нашых гульцоў будзе вельмі прыгожая форма з беларускім арнаментам.

Плануецца, што ўсе дамашнія і, магчыма, нават выязныя матчы будуць суправаджацца якаснымі інтэрнэт-трансляцыямі. Да таго ж «Віцязь» абяцае здзіўляць не толькі спартыўнымі дасягненнямі, але і рознымі культуралагічнымі праектамі, звязанымі з беларускай мовай і гісторыяй.

— Наогул, мы, вядома, ідзём да стварэння сапраўднай прафесійнай каманды, думаю, гэта адбудзецца ў наступныя 3—5 гадоў. Да клуба, дзе будзе арганізаваны сістэматычны трэніровачны працэс, дзе спартсмены змогуць атрымліваць грашовую кампенсацыю за сваю гульню. Што датычыцца гэтага сезона, то, вядома, хацелася б трапіць у чацвёрку лідараў чэмпіянату. У першую чаргу гэта надасць імпульс усёй камандзе, на якім можна працаваць яшчэ некалькі гадоў, і стане добрым прыкладам для людзей, якія развіваюць уласныя некамерцыйныя праекты ■




■ На слыху

# Памылка, якая можа паламаць кар'еру

## Тэквандыст Арман-Маршал Сіла дыскваліфікаваны на 4 гады за ўжыванне мельдонію

**Такая інфармацыя з'явілася на сайце Нацыянальнага антыдопінгавага агенцтва, якое атрымала рашэнне Спартыўнага арбітражнага суда ў Лазане па апеляцыі, пададзенай 17 студзеня 2017 года Сусветным антыдопінгавым агенцтвам на рашэнне, вынесенае дысцыплінарнай камісіяй Беларускай федэрацыі тэквандо 23 лістапада 2016 года ў справе Армана-Маршала Сілы. У выніку спартсмен атрымаў пакаранне — дыскваліфікацыю тэрмінам на 4 гады пачынаючы з даты ўступлення ў сілу арбітражнага рашэння CAS. Усе вынікі спаборніцтваў, дасягнутыя спартсменам з 13 ліпеня (уключна) да 11 жніўня 2016 года, ануляюцца. Дыскваліфікацыя спартсмена працягнецца з 20 ліпеня 2017-га па 6 красавіка 2021 года.**

Нагадаем, напярэдадні вылету на Алімпіяду ў Рыа-дэ-Жанэйра ў допінг-пробе аднаго з рэальных прэтэндэнтаў на ўзнагароду Армана-Маршала Сілы быў знойдзены мельдоній. Сам спартсмен, яго асабісты трэнер Юлія Сухавіцкая і доктар нацыянальнай каманды адразу па-



ведамілі, што Сіла не ўжываў забароненыя прэпараты. Якія да таго ж не здольныя паўплываць на вынік у тэквандо. Мельдоній у арганізме Сілы быў знойдзены ў канцэнтрацыі, якая перавышае ўсе межы разумнага, што таксама наводзіла на думку, што спартсмен не мог ужыць забаронены прэпарат свядома. *«У тэквандо допінг наогул практычна не ўжываецца, а мельдоній — тым больш. Я ўжо шмат разоў задаваў сабе пытанне, як ён мог трапіць да мяне ў арганізм. Я не першы год у спорце і прымаў усе меры засцярогі: пакінуў адкрытую бутэльку — больш з яе не піў, у невядомых месцах не ем... Нядобразычліўцаў у мяне тут таксама бывацам бы не было»*, — адзначыў у адным са сваіх інтэрв'ю Арман-Маршал Сіла.

Экспертыза паказала, што прэпарат быў у слоіку са спартыўным харчаваннем. Спецыялісты ўстанавілі, што мельдоній быў менавіта падсыпаны: яго канцэнтрацыя аказалася неразумернай. Акрамя экспертыз атлет двойчы праходзіў паліграф.

Нягледзячы на ўсё гэта, пакаранне аказалася суровым — 4 гады дыскваліфікацыі, у той час як, напрыклад, Марыя Шарапава за прыманенне мельдонію была адхіленая ад спорту толькі на паўтара года. Сіла не выключае, што гэтая дыскваліфікацыя можа датэрмінова завяршыць яго кар'еру.

Нагадаем, што спартсмен з'яўляецца двухразовым чэмпіёнам Еўропы (2014 і 2016 гадоў) у катэгорыі звыш 87 кг, двухразовым чэмпіёнам Еўропы сярод моладзі, шматразовым чэмпіёнам Беларусі. Ён адзіны айчынны тэквандыст, якому ўдалося заваяваць пуцёўку на Алімпійскія гульні ■

Матэрыялы падрыхтавала
Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

## Извещение о проведении «05» сентября 2017 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

**Сведения о продаваемом имуществе:**

| Номер предмета торгов | Информация о предмете торгов | Год выпуска | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Установка лазерной резки с ЧПУ Platino 1530 HS-3500 (PrimaPower, Италия)<br>Местонахождение: Республика Беларусь, г. Минск, пер. С.Ковалевской, 62-2 | 2007 | 243 864,00 | 12 193,20 |
| 2 | Гидравлический листогибочный пресс с ЧУП BYSTRONIC Beyeler 60 2550 (BYSTRONIC, Швейцария)<br>Местонахождение: Республика Беларусь, г. Минск, пер. С. Ковалевской, 62-2. | 2007 | 72 936,00 | 3 646,80 |
| 3 | Компрессор винтовой воздушный EKO 110GVST (Ekomak, Турция)<br>Местонахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2012 | 30 409,44 | 1 520,47 |
| 4 | Компрессор винтовой воздушный EKO 110GVST (Ekomak, Турция)<br>Местонахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2012 | 30 402,49 | 1 520,12 |
| 5 | Индукционная тигельная плавильная электропечь ИТПЭ-0258/0,35, ТГ2, (Термолит, Украина)<br>Местонахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2011 | 40 687,79 | 2 034,39 |
| 6 | Индукционная тигельная плавильная электропечь ИТПЭ-04/04, ТГ2, (Термолит, Украина)<br>Местонахождения: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 8, ОАО «Мотовело» | 2012 | 64 087,20 | 3 204,36 |
| 7 | Комплекс мобильный для производства легких стальных тонкостенных конструкций (Республика Беларусь)<br>Местонахождение: Республика Беларусь, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Маяковского, 1 (здание арочника), ООО «Стальтало» | 2012 | 26 332,14 | 1 317,61 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр. Жукова, 3.

**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY32 BAPB 3012 2013 1001 8000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код BAPBBY2X, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся « 05 » сентября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.08.2017 по 01.09.2017 включительно в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.torgi.agroconsult.by, mail: torgi@agroconsult.by

Телефоны для справок: Филиал ОАО «Белагропромбанк» – Гомельское областное управление Главный специалист отдела по работе с проблемной задолженностью Бондаренко Максим Святославович, тел. 8 (0232) 79-26-95, факс 8 (0232) 79-27-39. Организатор аукциона: тел./факс 8 (017) 399 66 39, GSM VEL 8 (029) 816-64-46, GSM MTS 8 (044) 540-64-46.

## Извещение о проведении торгов на право заключения договора оказания услуг по размещению рекламы на портале авторизации для идентификации абонентов WI-FI сетей

Аукционные торги проводятся **13 сентября 2017 г**. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

| № предмета торгов | Местонахождение WI-FI сетей, осуществляющих идентификацию абонентов через портал авторизации | Вид, количество средства рекламы и иные характеристики | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. в месяц с учетом НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Минск, пл. Привокзальная, 3. Вокзал станции Минск- Пассажирский | Интернет-баннер сверху либо снизу портала авторизации и полноэкранный интернет-баннер.<br><br>Интернет-баннер сверху либо снизу портала авторизации (согласно схеме):<br>длительность показа: постоянно (с возможностью закрытия их пользователем);<br>поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg, flash;<br>размеры: 300х250 пикселей;<br>вид размещения: статический, динамический без аудиосопровождения.<br><br>Полноэкранный интернет-баннер (согласно схеме):<br>длительность показа: 10с.;<br>поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg;<br>размеры: 468х60 пикселей;<br>оптимизация под экран устройства. | 6 720,0 | 672,0 |
| | Витебская область, г. Орша, ул. Заслонова, 3а. Вокзал станции Орша | | | |
| | Минская область, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 7. Вокзал станции Молодечно | | | |
| | Минская область, г. Борисов, ул. Труда, 7а. Вокзал станции Борисов | | | |
| | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фроленкова, д. 13. Вокзал станции Барановичи-Полесские | | | |
| | Гродненская область, г. Лида, ул. Труханова, 12В. Вокзал станции Лида | | | |
| | г. Гродно, ул. Буденного, 37. Вокзал станции Гродно | | | |
| | Брестская область, г. Лунинец, ул. Вокзальная, д. 6. Вокзал станции Лунинец | | | |
| | г. Брест, ул. Кижеватова, 1Б/1. Вокзал станции Брест-Центральный | | | |
| | Брестская область, г. Пинск, ул. Железнодорожная, 19. Вокзал станции Пинск | | | |
| | г. Гомель, Привокзальная площадь, 3. Вокзал станции Гомель | | | |
| | Гомельская область, г. Жлобин, Привокзальная площадь. Вокзал станции Жлобин | | | |
| | Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Октябрьская, д. 30. Вокзал станции Калинковичи | | | |
| | г. Могилев, Привокзальная площадь, 1. Вокзал станции Могилев | | | |
| | Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Вокзальная, 18. Вокзал станции Осиповичи | | | |
| | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Железнодорожная, 13. Вокзал станции Бобруйск | | | |
| | Могилевская область, г. Кричев, ул. Пугачева, 6. Вокзал станции Кричев | | | |
| | г. Витебск, ул. Космонавтов, 8. Вокзал станции Витебск | | | |
| | Витебская область, г. Полоцк, ул. Октябрьская, 44. Вокзал станции Полоцк | | | |
| | *Срок, на который заключается договор оказания услуг по размещению рекламы, – **3 года**.* | | | |

Документы на участие в торгах принимаются с **14.08.2017 по 08.09.2017** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– копию свидетельства о государственной регистрации организации или индивидуального предпринимателя;

– копию устава организации (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора);

– заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на счет организатора торгов.

